Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 29 (3933)
СУБОТА, 31 СТУДЗЕНЯ 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫНКА

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА

СЬЦЯГІ ПЕРАМОГ ЗАВАЯВАЛІ— „ПРАЛЕТАРЫ", „БАЛЬШАВІК", „КАМУНАР"

РАЎНЕНЬНЕ ПА ПЕРАДАВІКОХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ!

ЦЬВЯРДЗЕЙ КРОК, ВЫШЭЙ ТЭМПЫ У ЗМАГАНЬНІ ЗА ЗАВЯРШЭНЬНЕ ПАБУДОВЫ ФУНДАМАНТУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ

ПАСТАНОВА КОНКУРСНАЙ КАМІСІІ ПРЫ ЦСПСБ ПА ПРЫСУДЖЭНЬНІ 3-х ПЕРАХОДНЫХ СЬЦЯГАЎ

Уключаючы 42-х прадпрыемстваў БССР ва ўсесаюзны конкурс, конкурс па тры сьцягі і змаганьне за гонар прадпрыемстваў, выклікалі сярод рабочых мас новую хвалю творчай энтузіязму і актыўнасьці, накіраваных па вырашэньню канкрэтных вытворчых задач, і зьявіліся магутным сродкам далейшай мабілізацыі рабочых мас на рэалізацыю лозунгу ЦК УсеКП(б), па выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу і пасьляховую падрыхтоўку да трэцяга рашаючага году пяцігодкі на аснове сустрэчнага прамфінпляну.

Вядучы пяцярымірную барацьбу за генэральную лінію партыі, згуртоўваючы вакол яе рабочыя масы і даючы рашучы бальшэвіцкі адпор правым правага апартунізму, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, «лявацкім» загібам, двурушніцтву і прымірэнцтву да іх, замяняючы вялодна кіраўніцтва, здольнае на даным этапе праводзіць генэральную лінію партыі, — заводы і фабрыкі, уступіўшыя ў конкурс, дабіліся вялізарнейшых посьпехаў у справе выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

На аснове далейшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва і ўзьдыму іх на вышэйшую ступень, увядзеньня ряду рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, выцягненьня дадатковых захаваных магчымасьцей, рашучых і канкрэтных крокаў у справе перабудовы партыйнай, камсамольскай, прафэсыянальнай і культмасавай работы, з перанясеньнем яе ніжэйшых групп, брыгаду і агрэгат, — прадпрыемствы, што ўключыліся ў конкурс, дасягнулі значных посьпехаў у справе выкананьня задач, пастаўленых камуністычнай партыяй перад сацыялістычнай прамысловасьцю.

На падставе пратэставаных матэрыялаў, заслухоўваньня абгаворванага дакладу прадпрыемстваў, ліквідацыі асобных квартал з лепшымі паказьнікамі, — конкурсная камісія пры ЦСПСБ лічыць, што лепшымі прадпрыемствамі ў справе выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну асобнага кварталу ўмоў ўсесаюзнага конкурсу і конкурсу на 3 сьцягі ськулюцца:

а) чугуна-ліцейны і машына-будаўнічы завод «Пралетары» — Гомель;

б) гарбарня «Бальшавік» — Менск;

в) чугуна-ліцейны і машына-будаўнічы завод «Энэргія» — Менск;

г) гарбарня «Пралетары» — Гомель;

д) чугуна-ліцейны і машына-будаўнічы завод «Энэргія» — Менск.

Выходячы з гэтага, конкурсная камісія пры ЦСПСБ па прысуджэньні 3-х пераходных сьцягаў — ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ — і па абгаворы лепшых прадпрыемстваў для прамяваньня на ўсесаюзным конкурсе [illegible] прадпрыемстваў — [illegible]

ПРЫСУДЗІЦЬ ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ ІМЯ ЦК КП(б)Б — ЗАВОДУ «ПРАЛЕТАРЫ»—ГОМЕЛЬ:

за перавыкананьне прамфінпляну асобнага кварталу (109,3 проц.), выкананьне пляну на вышэйшы сабекошту прадукцыі (10,1 проц.);

за разгортваньне саспаборніцтва і ўдарніцтва і ўздым яго на вышэйшую ступень, стварэньне «сквозных» брыгад, практыку грамадзкага буксіру, пошуку новых ударнікаў (218 чал.)) і ахоп улаўніцтвам на 1 студзеня 1931 г. — 94,5 проц. агульнай колькасьці рабочых на заводзе;

за здавальняючае правядзеньне перавыбораў саветаў, скарачэньне і здавальняючае правядзеньне каэдагаворнай кампаніі і перавыкананьне пляну падпіскі на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» (107,75 проц.);

за здавальняючую падрыхтоўку сустрэчнага прамфінпляну на 1931 г., з павышэньнем колькасьці прадукцыі, супроць пазначанага ў гаспадарчых органаў на 17,8 проц.;

за значнае палепшэньне работы па арганізацыі прытоку рабочых прапаноў, іх рэалізацыі (ліквідацыя запазычанасьці на выкананьні рабочых прапаноў за 1931 г., прыток 49 прапаноў на пляну асобнага кварталу з эканоміяй у 150,5 тыс. руб.) і распрацоўку рацыяналізатарскага рахунку на 1931 г. у суме 150 тыс. руб.;

за канкрэтную работу па перабудове партыйнай і прафэсыянальнай работы з перанясеньнем яе ў брыгады, групы (афармленьне «трыкутнікаў», перабудова работы вытворчых нарад і інш.);

за пасьляховую арганізацыю прытоку рабочых у рады КП(б)Б і ЛКСМБ (за квартал прынята ў партыю 70 чал., ёсьць яшчэ 69 заяў, у КСМ прынята 48 рабочых);

за арганізацыю раду прадпрыемстваў па палепшэньні матар'яльна - бытавых умоў рабочых (арганізацыя закрытага разьмеркавальніка, палепшэньне рабочай сталоўкі, адкрыцьцё рамонтных майстэрань).

2. ПРЫСУДЗІЦЬ ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ ЦСПСБ ГАРБАРНІ «БАЛЬШАВІК» — МЕНСК:

за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу ў колькасным выразе — 108,87 проц., у цэнкавым—104,84 проц., пры вышэйшы сабекошту ў 11,52 проц. супроць плянавых 8 проц. і павышэньне прадукцыйнасьці працы на 2,2 проц. вышэй пляну, а таксама палепшэньне якасьці прадукцыі;

за арганізацыю прытоку ў рады КП(б)Б рабочых з вялікіх вытворчых стамак;

за разгортваньне і ўзьдым яго на новыя формы саспаборніцтва і ўдарніцтва (арганізацыя за квартал 42 ударных брыгад, з іх 17 «сквозных», прыток 225 ударнікаў, самазамацаваньне ла канца пяцігодкі — 68,4 проц. ад усёй колькасьці рабочых); канкрэтную барацьбу з лжэ-ўдарніцтвам (правядзенне самаправерак па сацыялістычных абавязкельствах, адсеяны 30 лжэ-ударнікаў);

за арганізацыю значнага прытоку рабочых прапаноў (за квартал 280 з экономіяй у 37 тыс. руб.);

за здавальняючую масавую працу [illegible] сустрэчнага прамфінпляну, дабіцца [illegible] прадукцыйнасьці [illegible] супроць камандзіровак [illegible] на цехах ад 11,1 проц. да 25,2 процантаў;

за добрае правядзеньне перавыбарчай кампаніі гарсавету (сёння 100 проц.), здавальняючае правядзеньне каллагіор[illegible]ная кампанія і перавыкананьне пляну падпіскі на пазыку (12,7 проц.);

за арганізацыю раду перадпрыемстваў па палепшэньні сацыяльна - бытавых умоў рабочых (палепшэньне работы сталоўкі з абслугоўваньнем усіх зьмен, арганізацыя буфетаў па цехах, арганізацыя сквізнарніка, закрытага разьмеркавальніка і рамонтных майстэрань).

3. ПРЫСУДЗІЦЬ ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ ІМЯ ЦК ЛКСМБ—ЗАВОДУ «КАМУНАР»—МЕНСК:

за перавыкананьне прамфінпляну асобнага кварталу ў колькасным выразе — 5,6 проц., па прадукцыйнасьці працы—0,2 проц., па зьніжэньні сабекошту — 0,5 проц., з адначасовым зьмяншэньнем колькасьці рабочай сілы на 0,8 проц. супроць пляну;

за значнае разгортваньне саспаборніцтва ва ўсіх яго формах (арганізаваны за асобны квартал 4 ударныя брыгады, 3 «сквозных» брыгады, 6 вытворчых калектываў, 9 камун і адна штурмовая брыгада з ахопам на 1/1—31 году 97,1 проц. усёй колькасьці рабочых заводу; самазамацавалася да канца пяцігодкі—95,5 проц.);

за арганізацыю шырокага прытоку рабочых прапаноў (354 за квартал) і складаньне рацыяналізатарскага рахунку на 1931 год з 157 прапаноў на суму 250 тыс. рублёў;

за дасягненьні ў справе мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў (сабрана 210 тон лому замест 80 тон паводле пляну);

за добра праведзеную работу па перавыбарах гарсавету і падпісцы на пазыку (перавыкананьне пляну на 64 проц.);

за прыток у рады партыі (за квартал 66 рабочых заводу);

за пасьляховую работу па перабудове камсамольскай работы, накіраванай на выкананьне прамфінпляну асобнага кварталу, актыўны ўдзел і ініцыятыву камсамолу ў арганізацыі саспаборніцтва і ўдарніцтва і ўздым яго на вышэйшую ступень (камуны, «сквозные» брыгады, самазамацаваньне), актыўны ўдзел у рацыяналізатарскіх мерапрыемствах і масава - выхаваўчую работу сярод рабочай моладзі;

за арганізацыю сустрэчнага прамфінпляну на 1931 год з павышэньнем колькасьці прадукцыі, якая выпускаецца, у сярэдзіны на 17 проц.;

за палепшэньне сацыяльна - бытавых умоў рабочых (арганізацыя становай на прыкладзе «Электропровода», арганізацыя алкормачнага пункту, закрытага разьмеркавальніка, рамонтных майстэрань і інш.).

4. Побач з прысудзэньнем прадпрыемствам пераходных сьцягаў, — конкурсная камісія лічыць неабходным прадставіць гэтым-ж заводы, як паказаўшыя лепшыя узоры бальшавіцкай барацьбы за прамфінпляны асобнага кварталу, якія змаглі спачатку ўзяць неабходныя тэмпы і трымаць іх на працягу ўсяго кварталу, для прамяваньня на ўсесаюзным конкурсе на лепшыя прадпрыемствы.

5. Адначасова з гэтым конкурсная камісія прадставіла для прамяваньня на [illegible] конкурсе друкарню «Палесдрук» [illegible] будаўнічы завод [illegible] пры гэтым, што:

а) «Палесдрук», выдзяляючы ініцыятыўнасьць [illegible] ў ліку іншых форм сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, вытворчых манэўраў — правесьці дасягненьні — пасьляхова правесьці годы работы на сваім прадпрыемстве. Побач з гэтым «Палесдрук» перавыканаў прамфінпляны асобнага кварталу на 0,5%; (у колькасным паказьнику); удзельнічаў у друкарні ахоплена 90% усяго калектыву, самазамацавалася да канца пяцігодкі 70%. У партыю перадана за квартал 56 чал., у ЛКСМБ—52 ч.

б) Завод «Энэргія» выканаў прамфінпляны асобнага кварталу на 100,43% — у цэнкавым азначэньні, пры зьніжэньні колькасьці рабочай сілы на 0,8% супроць пляну і перавыкананьне пляну па павышэньні прадукцыйнасьці працы на 13,35%. Прыток у партыю за квартал даў 55 таварышоў. Ахопленае ўдарніцтвам 69% агульнай колькасьці рабочых, самазамацавалася да канца пяцігодкі 67%; паступіла за квартал 149 рабочых прапанову з эфэктыўнасьцю ў 146 тыс. р. Пляны падпіскі на пазыку перавыкананы на 8%.

6. Адзначаючы рад буйных дасягненьняў у рабоце заводаў, якія выйшлі ў першых радах па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну асобнага кварталу і пралстаўленых для прамяваньня на конкурсах, конкурсная камісія пры ЦСПСБ звяртае ўвагу ўсіх арганізацый і рабочых гэтых прадпрыемстваў на неабходнасьць больш рашучай барацьбы за якасьць прадукцыі і барацьбы з бракам (завод «Пралетары», «Камунар», «Энэргія»); узмацненьне тэмпаў рэалізацыі рабочых прапаноў, вырокае скарыстаньне работы вытворчых нарад («Бальшавік», «Камунар», «Энэргія»).

Адначасова з гэтым, конкурсная камісія звяртае ўвагу арганізацый усіх прадпрыемстваў на неабходнасьць далейшай упартай работы ўсіх зьвеньняў заводу і яго арганізацый за канчатковую дакладную перабудову ўсёй работы у адпаведнасьці з пастановай 5-га пленуму УсеЦСПС.

7. Конкурсная камісія лічыць неабходным перадаць пераходныя сьцягі лепшым прадпрыемствам тэрмінам на 2-квартал з тым, каб і у далейшым пасьля кожнага паўгодзьдзя, пераглядаць справу прысуджэньня пераходных сьцягаў прадпрыемствам, якія дасягнуць лепшых паказьнікаў па ўсіх умовах конкурсу за паўгодзьдзе.

Камісія з асобнай сілай падкрэсьлівае, што абавязковай умовай конкурсу на атрыманьне пераходных сьцягаў і надалей, побач з выкананьнем усіх колькасных паказьнікаў прамфінпляну, павінна быць бязумоўнае выкананьне якасных паказьнікаў, што вынікае адным з асноўных [illegible] на прысуджэньні прадпрыемстваў.

8. Далейшую работу па праверцы дасягненьняў прадпрыемстваў па конкурсе неабходна праводзіць шляхам арганізацыі такой гэтай справы яшчэ большай масавасьці пры прыцягненьне Ударнікаў, добраахвотнікаў, прафактыву і большага асьвятленьня ў друку, а таксама шляхам вынаходзіньня ўзаемаправерачных сьцягаў.

9. Камісія лічыць неабходным правесьці перадачу сьцягаў на вырокіх рабочых сходах пры спэцыяльна вызначаных дэлегацыі, вырокае скарыстаньне гэта мерапрыемства для далейшай мабілізацыі рабочых мас на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну пяцігодкі за чатыры гады, на барацьбу за генэральную лінію партыі.

Ударнікаў пяцігодкі— у партыю Леніна

Моц бальшавіцкай партыі заключаецца ў тым, што яна зьяўляецца партыяй узыходзячай клясы пралетарыяту, што партыя, арганізаваная і выхаваўчая Леніным, з дня ў дзень папаўняецца перадавымі пралетарамі фабрык і заводаў. Рост камуністычнай партыі — выразны доказ моцнай сувязі авангарду са сваёй клясай і показальнік непамерна вялікага і глыбокага давер'я мас да сваёй партыі. Тав. Сталін, у адказах на пытаньні студэнтаў Сьвярдлоўскага ўнівэрсытэту (люты 1930 г.) наконт масавага прыліву рабочых у партыю, пісаў: «ЖАДАНЬНЕ ЦЭЛЫХ ЦЭХАЎ, НАВАТ ЗАВОДАЎ УСТУПІЦЬ У ПАРТЫЮ ЁСЬЦЬ АДЗНАКА ВЯЛІКАГА РЭВАЛЮЦЫЯНАГА ЎЗДЫМУ МІЛЬЁННЫХ МАС РАБОЧАЕ КЛЯСЫ, АДЗНАКА ПРАВІЛЬНАСЬЦІ ПАЛІТЫКІ ПАРТЫІ, АДЗНАКА ГУЧНАГА ЎХВАЛЕНЬНЯ ГЭТАЙ ПАЛІТЫКІ ШЫРОКІМІ МАСАМІ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ».

Не адзінкі, а сотні і тысячы, ідуць у бальшавіцкую партыю, каб пад ленінскімі сьцягамі змагацца за высокія тэмпы індустрыялізацыі краіны, за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Асаблівы бурны прыліў у рады партыі мы мелі і мсем зараз у сувязі З ЛЕНІНСКІМІ ДНЯМІ. Сёмая гадавіна са дня сьмерці вялікага правадыра партыі Леніна рабочымі масамі была сустрэнута павышэньнем свайго творчага энтузіязму, перадачай сваіх лепшых таварышоў—ударнікаў 5-годкі ў рады ленінскай партыі. Аб размерах гэтага прыліву можна судзіць па тых папярэдніх дзённа-нядоўных вестках, якія мы зьмяшчалі і зьмяшчаем сёньня ў «Зьвязьдзе». Наўрад ці знойдзецца ў КП(б)Б такая партарганізацыя, у якую-б перадавыя рабочыя, батракі і актывісты-калгасьнікі не падалі заяву аб уступленьні ў партыю.

Задача партыйных ячэек і раённых арганізацый заключаецца ў тым, каб гэты прыліў ударнікаў у партыю разьвіваць яшчэ шырэй і ўзрошчаць актыўнасьць рабочае клясы скарыстаць для папаўненьня партыі. Задача заключаецца у тым, каб, пачынаючы ад сёмай гадавіны са дня сьмерці Леніна, пеш чым да гэтага часу, сыстэматычна вербаваць у рады партыі перадавых рабочых-ударнікаў, сельска-гаспадарчых рабочых, батракоў і калгасьнікоў, ліквідаваўшы свае тэндэнцыі ў змаганьні з кулацтвам. Тым больш, што сыстэматычная, штодзённая вярбоўчая работа на працягу апошняга 1930 г. па радзе і нават большасьці райпартарганізацый была пастаўлена яўна НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА. У КП(б)Б за першыя тры кварталы 1930 г. прынята каля 9 з паловай тыс. чал. у той час, як за ўвесь 1929 г. было прынята толькі 6.045 чал. Аднак, у суставіўленьні з тымі гіганцкімі палітычнымі задачамі, якія стаяць перад КП(б)Б, гэтую лічбу трэба прызнаць невыстарчальнай. АСАБЛІВА СЛАБА ІДЗЕ РОСТ ВЯСКОВЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ за кошт сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў. НАРАЎЛЯНСКАЯ, напрыклад, арганізацыя за мінулы год прыняла ў свае рады толькі 27 чал. ДУБРОВЕНСКАЯ партарганізацыя — 50 чал., ЧАШНІЦКАЯ — 70 чал. і г. д., а КАСЬЦЮКОВІЦКАЯ райпартарганізацыя, наперакор дырэктывам партыі, у 1930 г. ня толькі не ўзмацніла вярбовачнай работы, а, наадварот, зьнізіла прыём у параўнаньні з папярэднім 1929 г. на 15 проц. Гэта пры наяўнасьці ў раёне старых калгасаў, камун, батрацтва.

Гэта можна тлумачыць толькі апартуністычнай недастатковай вярбовачнай работы, з боку асобных арганізацый, наяўнасьцю нічым непрыкрытай бязьдзейнасьці, якая перарасла ў апартуністычную практыку. У радзе-ж тых партарганізацый, у якіх параўнаўча з вышэйпамянёнымі рост ідзе і лепш, мы павінны канстатаваць новыканаўньне дырэктыў партыі аб забесьпячэньні 50 порц. сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў у агульнай колькасьці прыманых. Так, у БАГУШЭЎСКАЙ арганізацыі сярод 28 чал. прынятых у апошнім квартале мінулага году толькі 9 рабочых і батракоў. Гэты факт трэба разглядаць на інакш, як грубае ігнараваньне дырэктыў партыі, накіраваных на пашырэньне пралетарскай праслойкі ў радох КП(б)Б.

КП(б)Б на працягу ўсяго пярыяду трымае цьвёрды курс на няўхільнае павялічэньне ў сваіх радох рабочай праслойкі. І ў гэтых адносінах увогуле КП(б)Б дасягнула значных посьпехаў. У 1928 г. сярод прыманых рабочых было толькі 56 проц., у 1929 г.—74,1 проц., а сярод прынятых за адно першае паўгодзьдзе 1930 г. рабочыя складалі 75,7 проц.

Усякае невыканаўнае дырэктыў партыі аб забесьпячэньні ўстаноўленага процанту для катэгорыі рабочых і батракоў сярод прыманых, мы павінны разглядваць, як ігнаравае штучна зьнізіць павялічэньне рабочага ядра ў радох КП(б)Б.

Вярбоўка ў партыю перадавых пралетарскіх элементаў — адна з важнейшых частак партыйнага будаўніцтва, умацаваньня радоў партыі, значыцца і расцвіцьвіньня партыйнага [illegible] частках [illegible] ШТО ВЫ [illegible] Таму ўсякае недадзяканае [illegible] вярбовачнай работы і росту арганізацый КП(б)Б павінна расцэньвацца як найгоршы від правых правага апартунізму на практыцы. Ячэйкі і райпартарганізацыі павінны бязьлітасна біць па ўсіх стаўках апартуністаў на самацёк у справе росту, па ўсіх найменшых спробах штучна прыпыніць прыём у партыю перадавых рабочых, батракоў, сельска-гаспадарчых рабочых і актывістаў - калгасьнікаў.

Вядучы бязьлітаснае змаганьне супроць правага апартунізму, галоўнай небясьпекі на даным этапе, «лявацкіх» элемэнтаў і прымірэнцаў да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі, ачышчаючы свае рады ад двурушнікоў, кулацкіх агентаў і здраднікаў партыі, партарганізацыям неабходна ўсе сілы накіраваць на папаўненьне сваіх радоў за кошт тых багатых рэзэрваў, якія ёсьць у наяўнасьці. Гэтыя рэзэрвы перш за ўсё,— шырэйшыя масы рабочых - ударнікаў, актыўных барацьбітоў за ажыцьцяўленьне лёзунгу «Пяцігодка—за чатыры гады». «Ударнікі—гэта тыя перадавікі, якія зьяўляюцца пепшым рэзэрвам нашай бальшэвіцкай партыі» (Кагановіч). З гэтых рэзэрваў і павінна праз штодзённае разгортваньне вярбовачнай работы чэрпацца папаўненьне бальшавіцкіх радоў.

На меншым рэзэрвам і базай для росту партыі зьяўляецца ленінскі камсамол. Між тым партыйныя арганізацыі і ячэйкі на мясцох далёка нездавальняюча папаўняюць свае рады за кошт камсамолу.

Ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі аб суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва, як клясы, выклікала нябывалы рост актыўнасьці пралетарыяту і батрацка-бядняцкіх мас вёскі. У асобе калгасьнікаў створана сапраўды моцная новая апора партыі на вёсцы. Гэта ўсё дае вялікія магчымасьці і пэрспэктывы для росту вясковых партарганізацый.

Ня з меншым посьпехам павінна быць скарыстана і тая актыўнасьць, якая выразна ў масах работніц, батрачак і калгасьніц, што праз делегацыя сходы, працоўчы на фабрыцы, на заводзе, саўгасе і калгасе, пад кіраўніцтвам партыі, вядуць змаганьне за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Нельга не папярэдзіць райпартарганізацый аб аналогічнасьці наступнага этапу. Асобныя работнікі на мясцох у пагоні за колькасьцю забываюць часьві пра якасьць пэрсанальнага адбору маных у партыю. Усе партарганізацыі, ячэйкі у гэтых адносінах павінны няўхільна выконваць словы т. Сталіна аб тым, што «ПАРТЫЯ ПАВІННА ЗАХАВАЦЬ У МОЗЫ ВЫПРАБАВАНЫ МЯТАД ІНДЫВІДУАЛЬНАГА ПАДЫХОДУ ДА КОЖНАГА, ХТО ЖАДАЕ УСТУПІЦЬ У ПАРТЫЮ, І ІНДЫВІДУАЛЬНАГА ПРЫЕМУ У ГАРТЫЮ. НАМ ПАТРЭБНА НЯ ТОЛЬНІ КОЛЬКАСЬЦЬ, АЛЕ І ЯКАСЬЦЬ». У партыі павінны быць прыняты толькі сапраўды перадавыя пралетары, загартаваныя ў змаганьні за выкананьне пяцігодкі, толькі сапраўды перадавыя сельска-гаспадарчыя рабочыя, батракі і калгасьнікі, якія давялі сваю адданасьць партыі ў змаганьні з кулацтвам—гэтага мы не павінны ні на хвілину забываць пры разгортваньні вярбовачнай работы.

Сацыялістычны транспарт—на вышэйшую ступень

Партыяй і ўрадам за апошні час прыняты рад пастаноў, накіраваных да ўмацаваньня транспарту, які грае важнейшую ролю ў справе ажыцьцяўленьня плянаў сацыялістычнага будаўніцтва і ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны.

У гэтых-жа пастановах з усёй пачутнай падкрэслена, што, ня гледзячы на сур'ёзныя дасягненьні транспарту, ён зьяўляецца ўсё-ж адным з найбольш адсталых вучасткаў народнай гаспадаркі і пагражае стаць «вузкім месцам» у нашым далейшым разьвіцьці.

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) і трэцяя сэсія ЦВК Саюзу, [illegible] прынятыя адзінага народна - гаспадарчага пляну на 1931 г., запраектавалі вігачныя ліміты ў галіне рэканструкцыі транспартнай гаспадаркі і поўнай мабілізацыі ўсіх паўўных рэсурсаў для выкананьня чыгункай напружаных заданьняў.

Учора ў «Зьвязьдзе» апублікавана адозва Савету Народных Камісараў СССР і Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) па пытаньнях транспартнага будаўніцтва. Гэта адозва мае выключна важнае палітычнае значэньне і павінна прыкаваць да сябе ўвагу ўсёй партыі, усяе рабочае клясы, усіх працоўных.

Адозва зьяўляецца сапраўднай баявой праграмай дзеяньняў для партыйных, гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый, практычным кіраўніцтвам у справе барацьбы за падцягненьне транспарту да ўзроўня перадавых галін сацыялістычнага будаўніцтва.

Адной з прычын адставаньня транспарту зьяўляецца невыстарчальны высокія тэмпы яго рэканструкцыі.

Адозва СНК і ЦК ва ўсю шырыню ставіць гэту праблему, абавязвае СНА на працягу трох тыдняў разглядзець план рэканструкцыі і абавязвае наменіць канкрэтныя мерапрыемствы, якія-б забесьпечылі поўнае выкананьне прамысловасьцю даных ёй у гэтых адносінах заданьняў.

У транспартнай гаспадарцы рашаючую ролю адыгрывае становішча рухавага складу. СНК і ЦК акрэсьлівае грандыёзную праграму разьвіцьця гэтай галіны гаспадаркі, ставячы перад прамысловасьцю задачу павялічэньня праграмы паравозабудаўніцтва ў бягучым годзе да 1.028 паравозаў супроць 612 у 1929-30 г., таварных вагонаў — 60 тыс. супроць 17,6 тыс. у 1929-30 г.

Адначасова ВСНГ даецца заданьне без усякай чаргі забясьпечыць транспарт апаламі, улічваючы неабходнасьць накапленьня рэзэрваў. З другога боку, перад транспартам пастаўлена баявое заданьне—на працягу месяцу дабіцца зьнізіньня выдатканьня апалу ня менш чым на 15 проц.

Пытаньні палепшэньня паравознага парку ў вялікай ступені залежаць ад ужываньня правільных матэдаў язды, а таксама ад пастаноўкі нагляду і рамонту паравозаў. Адозва дае катэгарычныя дырэктывы па вывучэньні канкрэтных умоў і сыстэм язды і шырокага ўжываньня тых з іх, якія найбольш поўна апраўдалі сябе, а таксама па ўстанаўленьні акрэсьленай сыстэмы рамонту, якая гарантавала-б найбольшае захаваньне паравознай гаспадаркі.

Улічваючы важнейшае значэньне выразнасьці ў рабоце апарату, СНК і ЦК намечаў рад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў па спрашчэньні і ўмацаваньні арганізацыйнай структуры транспарту, што забясьпечвае найбольш поўнае ажыцьцяўленьне прынцыпу адзіначальня, упосіць большую гібкасьць у сыстэму кіраваньня.

Работа кадраў адыгрывае важнейшую ролю ў справе ўмацаваньня транспарту. Задача ліквідацыі транспартнага пралетарыяту, забесьпячэньне транспарту кваліфікаванай рабочай сілай, падрыхтоўка новых кадраў і перакваліфікацыя асобных груп работнікаў—павінна арабіцца цэнтрам увагі транспартных органаў і мясцовых партарганізацый. Асаблівая ўвага павінна быць у бліжэйшы-ж час зьвернута на рэалізацыю пастаноў партыі і ўраду аб звароце на транспарт работнікаў, якія скарыстоўваюцца не па спэцыяльнасьці.

Сыстэма заработнай платы мела ў радзе транспартных арганізацый істотныя недахопы, якія вынуліся ў іншаньні да ўраўненьня розных катэгорый работных. Рашуча асуджаючы тэндэнцыі да ўраўненьня СНК і ЦК абавязваюць ЦК чыгуначнікаў і НКПС «забясьпечыць сапраўдны правядзеньне [illegible] ў жыцьцё прынятай ЦК УсеКП(б) пастановы ад 10-га студзеня 1931 г. аб павышэньні заробкаў парнавозных брыгадам, шляхам павялічэньня вакілёмэтравай аплаты».

Адначасова павінны быць прыняты рашучыя меры па палепшэньні арганізацыі забясьпячэньня чыгуначнікаў, па палепшэньні іх жыцьцёвых і культурных умоў.

Выключна напружаная работа транспарту патрабуе асаблівай увагі да пытаньняў умацаваньня працэсыцыпліны, бязьлітаснай барацьбы з безадказнасьцю, расхлабанасьцю, парушэньнем прынцыпаў адзіначальня, з цякучасьцю рабочай сілы. У гэтым напрамку партыйныя, прафэсыянальныя і адміністрацыйныя арганізацыі павінны павесьці ўпартую штодзённую работу, улічваючы ўзгады адміністрацыйнае ўдзейнасьці з шырока-разгорнутай выхаваўчай работай, дабіваючыся няўхільнага росту спаборніцтва і ўдарніцтва, узьлому творчай актыўнасьці мас, арганізуючы ня вакол дзейнасьці новатворчых вытворчых сэкцый у складзе прафсаюзных арганізацый, райпрафсаўчаў, дарпрафсаўчаў і ЦК саюзу чыгуначнікаў.

Ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў, намечаных адозвай СНК і ЦК, патрабуе рашучага палепшэньня якасьці ўсёй партыйнай і прафэсыянальнай работы, далейшай перабудовы яе ў бок павароту «тварам да вытворчасьці», канкрэтызацыі кіраўніцтва масамі, перанясеньня цэнтру ўвагі ў нізавыя вытворчыя зьвенні.

Але зусім відавочна, што выкананьне задач, што стаяць перад транспартам, немагчыма без штодзённай практычнай дапамогі з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый.

Адозва СНК і ЦК павінна забясьпечыць круты пералом ва ўсёй рабоце транспарту у бок рашучага палепшэньня ўсёй яго работы.

На-бальшавіцку ўзяўшыся за работу, перамагаючы стаячыя на шляху труднасьці, мабілізуючы масы па барацьбу з усякімі праявамі апартунізму—мы дабіемся рашаючых зрухаў у справе надзвычай важнай галіны транспарту, забясьпечыць гэтым выкананьне плянаў вялікіх работ гэтага году пяцігодкі, заваяваньне набудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі.

Камісія выкананьня пры СНК БССР

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

На падставе вялізарных дасягненьняў рабочае клясы СССР у справе сацыялістычнага будаўніцтва, тэмпы разгортваньня народнай гаспадаркі ў 1931 г., вызначаныя ўрадам СССР і БССР, больш высокія, чым у першых двух гадох пяцігодкі. Ажыцьцяўленьне гэтых задач патрабуе прыняцьця ўсіх захадаў да ўзмацненьня барацьбы з недахопамі ў рабоце дзяржаўнага апарату, у асаблівасьці да барацьбы з бюракратызмам і цяганінай, да ўзмацненьня савецкай дысцыпліны.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР лічаць, што арганізацыя фактычнай праверкі выкананьня дырэктыў ураду зьяўляецца адзнай з галоўнейшых задач кіраўніцтва сацыялістычнымі будаўніцтвам.

Выходячы з гэтага, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Стварыць, побач з існуючымі асноўнымі камісіямі Савету Народных Камісараў—Эканамічнай Нарады і Дзяржаўнай Плянавой Камісіі, сталую Камісію Савету Народных Камісараў пад назвай «Камісія выкананьня».

2. Галоўнымі задачамі камісіі лічыць: праверку фактычнага выкананьня дырэктыў ураду і ўзмацненьне дысцыпліны ва ўсіх зьвярэнку дакладу, дзяржаўных і гаспадарчых арганізацыях.

3. Камісію назначыць у складзе старшыні СНК БССР т. ГАЛАДЗЕДА, М. М. (старшыня Камісіі выкананьня), нам. старшыні СНК і Народнага Камісара Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі т. КАЛІНІКА (нам. старшыні Камісіі), сакратара ЦК КП(б)Б т. ШАРАНГОВІЧА, старшыні ЦСПСБ т. РЫЖОВА і старшыні праўленьня Белкалгасцэнтру т. МІЦЬКОВА.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

30 студзеня 1931 г.
г. Менск.

Стварэньне Камісарыяту Воднага Транспарту

МАСКВА. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляе:

1. Выдзяліць з-пад ведама народнага Камісарыяту [illegible] і Шляхоў Зносін рэчны і марскі транспарт і [illegible] партовую гаспадарку.

2. Стварыць для кіраўніцтва рэчным і марскім транспартам і ўсёй партовай гаспадаркі САМАСТОЙНЫ УСЕСАЮЗНЫ НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ.

3. Прапанаваць Савету Народных Камісараў Саюзу ССР даць кіруючыя ўказаньні аб арганізацыі Народнага Камісарыяту Воднага Транспарту з тым, каб новазарганізаваны народны камісарыят мог неадкладна прыступіць да працы.

Даручыць народнаму камісару Шляхоў Зносін і народнаму камісару воднага транспарту ў 3-х месячны тэрмін распрацаваць і унесьці на зацьвярджэньне заканадаўчых органаў зьмену існуючага палажэньня аб Народным Камісарыяце Шляхоў Зносін і праекты палажэньняў аб гэтых камісарыятах.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР—
М. КАЛІНІН.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР—
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР—ЕНУКІДЗЕ.

Масква, Крэмль, 30-га студзеня 1931 г.

Тав. Янсон—нарком Воднага транспарту

МАСКВА. Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР пастанаўляе: НАЗНАЧЫЦЬ ТАВ. ЯНСОНА, МІКОЛУ МІХАЙЛАВА, НАРОДНЫМ КАМІСАРАМ ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ САЮЗУ ССР.

ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ДРАПЕЖНІКІ прагнуць пакончыць З НЕНАВІСНЫМ ІМ САВЕЦКІМ САЮЗАМ Рамэн Ролян выкрывае Пан-Эўроп

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ДАЛІ КП(б)Б

•новыя калёны перадавых пралетараў-ударнікаў змаганьня за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

ВЯРБОУКА У ПАРТЫЮ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ — ПЕРАДАВЫХ БАТРАКОЎ І КАЛГАСЬНІКАЎ, ЗАГАРТАВАНЫХ У ЗМАГАНЬНІ З КУЛАЦТВАМ — ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА КОЖНАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ І ЯЧЭЙКІ

Камсамольна-ўдарніца фабрыкі «Беларуска» тав. ГЕРШОН, у ленінскія дні уступіла ў КП(б)Б.

За марксыцка-ленінскае выхаваньне прынятых у партыю

Ленінскія дні перадавымі рабочымі-ўдарнікамі адзначаны масавым уступленьнем у рады КП(б)Б. Бадай, не зноўдзецца ў КП(б)Б ні адной райпартарганізацыі, у якую-б у сувязі з сёмай гадавінай з дня сьмерці арганізатара і правадыра бальшавіцкай партыі не паступілі заявы ад перадавых пралетараў, с.-г. рабочых, батракоў і актывістаў-калгасьнікаў аб прыёме іх у партыю Леніна. Ленінская папаўненьне паявіліць пралетарскую праслойку, умацуе рады КП(б)Б. Ленінскае папаўненьне высоўвае перад раённымі парт-арганізацыямі і парт'ячэйкамі рад важнейшых задач.

Першая з іх — своячасовае афармленьне ў партыі новапаступаючых. У рад ячэек паступілі калектыўныя заявы од рабочых-ударнікаў. Партыя дала выразную дырэктыву ўсім партыйным арганізацыям і калектывам, што адбор пры зацьверджаньні павінен быць толькі ІНДЫВІДУАЛЬНЫ і самы ўважлівы. Калектыўная падача заяў не азначае, што ўсе падаўшыя заявы могуць быць прыняты ў КП(б)Б. У ПАРТЫЮ МОГУЦЬ БЫЦЬ ПРЫНЯТЫ ТОЛЬКІ САПРАЎДЫ ПЕРАДАВЫЯ РАБОЧЫЯ-УДАРНІКІ, ЯКІЯ ДАКАЗАЛІ СВАЮ АДДАНАСЬЦЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ І ПРАЯВІЛІ СЯБЕ, ЯК АКТЫЎНЫЯ ЗМАГАРЫ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЯЦІГОДКІ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ.

Другая задача—РАЗГАРНУЦЬ БАЛЬШАВІЦКАЕ ВЫХАВАНЬНЕ ПРЫНЯТЫХ У ПАРТЫЮ. На прыкладах бязьлітаснага змаганьня УсеКП(б) за генэральную лінію партыі, супроць правых апартуністаў — галоўнай небясьпекі на даным этапе, «лявацкіх» элементаў і прымірэнцтва да ўхілаў ад ленінізму прынятыя ў партыю павінны быць выхаваны і загартаваны для самаадданай работы і барацьбы за ажыцьцяўленьне наказаў Леніна, за лічэ больш умацненае разьвіцьцё пераможнага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце.

Ленінскі прыліў у партыю павінен яшчэ больш умацніць змаганьне партыйных арганізацый і ячэек супроць усіх праяўленьняў правага і «левага» апартунізму на практыцы, умацніць змаганьне за яшчэ больш высокія тэмпы індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыю кулацтва як кляс на базе суцэльнай калектывізацыі.

Рад партыйных калектываў (фабрыка «Кастрычнік», Менск і інш.) прыступілі ўжо да разгортваньня марксыцка-ленінскага выхаваньня прынятых у партыю. Гэты прыклад перадавых павінен неадкладна выклікаць дзейнасьць і ўсіх іншых партыйных калектываў і ячэек. Сетка партасьветы (сав. партшколы, гурткі і ўсе іншыя віды вучобы) павінны неадкладна ПЕРАКЛЮЧЫЦЦА НА АБСЛУГОЎВАНЬНЕ ЛЕНІНСКАГА ПРЫЛІВУ.

Наступная задача — УЦЯГНЕНЬНЕ Ў ПАРТЫЙНУЮ РАБОТУ ПРЫНЯТЫХ. Адсоўваючы ў ўступіўшых у кандыдаты партыі на будзе ў тым выпадку і пры тэй думцы, калі яны адразу будуць уцягнуты ў партработу. Прычым пры нагрузцы партабавязкамі таго ці іншага таварыша да кожнага з іх у паасобку павінны быць праўлены самыя ўважлівыя адносіны. Нагрузка даецца ў адпаведнасьці з умовамі работы і сіламі таго ці іншага таварыша.

І нарэшце, партыйныя арганізацыі вярбоўку ў партыю рабочых-ударнікаў, перадавых батраку, сельгаспрабочых і калгасьнікаў-актывістаў павінны ЗРАБІЦЬ СВАЁЙ ШТОДЗЕННАЙ СЫСТЭМАТЫЧНАЙ РАБОТАЙ. З дня ў дзень партыйныя ячэйкі павінны папаўняць свае рады за пік тых багатых навычарпальных рэзэрваў, якія ёсьць у рабочай класе. Не ад выпадку да выпадку, а штодзенна, праз узмацненьне палітычна-масавай работы павінны вербаваць у рады КП(б)Б перадавых пра[illegible], батракі і актывісты-калгасьні[illegible]

Стаўка на самацёк

(Ад нашых кар.).

Нераўлянская райпартарганізацыя за мінулы год прыняла ў свае рады толькі 27 чалавек. Гэта лічба выразна характарызуе тое, што райпартарганізацыя зусім слаба вяла работу па вярбоўцы ў свае рады сельгаспрабочых, батракоў і актывістаў-калгасьнікаў. У раёне вельмі вялікая база для росту партарганізацыі. На фабрыцы працуе 206 рабочых, у раёне шмат батракоў і актыўных калгасьнікаў.

* * *

Чашніцкая райпартарганізацыя за мінулы год вырасла толькі на 70 чалавек. [illegible] спрод прынятых—45 батрако[illegible] гасьнікаў. За апошні [illegible] здаражаецца [illegible]

Раўняйцеся па перадавых

Па пытаньні росту партыі парткалектыў фабрыкі «Кастрычнік» разгарнуў шырокую работу сярод рабочых-ударнікаў. Напярэдадні ленінскіх дзён былі праведзены нарады з рабочымі, якія маюць дарэвалюцыйны вытворчы стаж, з работніцамі, жонкамі рабочых па пытаньні росту КП(б)Б за лік перадавых рабочых, аб пасьпяховым сацыялістычным будаўніцтве, змаганьні партыі па два фронты з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі.

На нарадах старымі рабочымі былі абгавораны кандыдатуры ўдарнікаў, уступаючых у партыю.

На вечарох, праведзеных па агрэгатах, прынялі актыўны ўдзел шырокія колы рабочых у абгаварэньні далейшых задач рабочага калектыву і партарганізацыі ў справе змаганьня за прамфінплян, за выкананьне і перавыкананьне плянаў трэцяга году пяцігодкі, па пытаньні росту КП(б)Б за лік лепшых рабочых-ударнікаў.

Парткалектыў і пэх'ячэйкі скарысталі ўсе віды і формы масавай работы для падрыхтоўкі дзесяткаў ударнікаў да ўступленьня ў ленінскую партыю. Напярэдадні ленінскіх дзён цэхавымі ячэйкамі прынята ў партыю 106 рабочых. Сярод уступіўшых у партыю — пераважная большасьць рабочых з дарэвалюцыйным вытворчым стажам. Больш як 20 рабочых маюць 25-ці—35-цігадовы вытворчы стаж.

Цэх'ячэйка трэцяга агрэгату дабілася бліскучых посьпехаў у справе вярбоўкі рабочых у партыю. За ленінскія дні яна прыняла 45 лепшых рабочых-ударнікаў.

Зараз партыйным калектывам распрацаваны мерапрыемствы па ахопе сеткай партыйнай асьветы новых уступіўшых у партыю рабочых. Большасьць з іх прымаюцца да пачатковых партыйных школ. Арганізуюцца спэцыяльныя гурткі па вывучэньні статуту і праграмы КП(б)Б, па азнаямленьні кандыдатаў з партыйным будаўніцтвам, з бараньбой партыі за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Поваапрынятыя ўцягваюцца ў партыйна-грамадзкую работу на фабрыцы.

Парткалектывам 1-га лютага абвешчан месячнік самаправеркі па выкананьні дырэктыў партыі аб росьце за лік рабочых-ударнікаў. У часе месячніка будуць праведзены нарады з рабочымі, якія маюць вялікі вытворчы стаж, будзе праведзена праверка, як члены і кандыдаты партыі падрыхтоўваюць рабочых-ударнікаў для ўступленьня ў партыю. Уся работа па самаправерцы будзе цесна ўвязана з дзесяцігодзьдзем існаваньня партарганізацыі шматвяк фабрыкі.

У.

Ленінскі прыліў у КП(б)Б

ВІЦЕБСК. Па 11-ці прадпрыемствах у дні сёмай гадавіны з дня сьмерці Леніна ў партарганізацыю паступілі 243 заявы ад лепшых ударнікаў аб прыёме іх у КП(б)Б.

АРЛОЎ.

ТАЛАЧЫНО. Трыма рабочымі гарбарні паданы заявы аб уступленьні ў КП(б)Б. Сярод іх адзін рабочы-ўдарнік з 30-гадовым вытворчым стажам. У саўгасе Райцы падалі заявы аб уступленьні ў партыю дзьве сельска-гаспадарчыя работніцы-ўдарніцы. Усяго па раёне рабочымі падана 13 заяў, батракамі і актывістамі-калгасьнікамі — 35 заяў.

Р. К.

БАБРУЙСК. Перадавымі рабочымі-ўдарнікамі падана 120 заяў аб уступленьні ў рады партыі Леніна.

САПОЖНІКАВА.

МАГІЛЕЎ. Нядэўна адбыўся першы раённы зьлёт работніц-ударніц. Зьлёт падагуліў работу па выкананьні прамфінплану за асобны квартал і абмеркаваў кантрольныя лічбы на трэці рашаючы год пяцігодкі. У сувязі з ленінскімі днямі зьлёт перадаў у партыю 79 лепшых работніц-ударніц і ў ленінскі камсамол—40 ударніц.

П. З.

ЗАСЛАЎЕ. У ленінскія дні па раёне падана 91 заява аб уступленьні ў КП(б)Б. Сярод падаўшых заявы — шмат байцоў-ударнікаў пагранчасьцей. Бядняцка-серадняцкімі масамі пад кіраўніцтвам парт'ячэек у ленінскія дні арганізавана 5 новых калгасаў, з якіх 3 ужо аформлены. Усяго ў калгасы ўступіла 190 гаспадарак.

ВАЎЧКОЎ.

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. У ленінскія дні ў райпартарганізацыю паступіла 25 заяў ад рабочых-ударнікаў аб прыёме іх у КП(б)Б. У сваіх заявах рабочыя запэўніваюць, што, знаходзячыся ў радох УсеКП(б), разам з усёй партыяй будуць няўхільна ажыцьцяўляць ленінскія наказы.

РАБЦАЎ.

БАРЫСАЎ. На буйнейшых прадпрыемствах Барысава перадавыя рабочыя-ўдарнікі ў ленінскія дні падалі заявы аб прыёме іх у рады КП(б)Б. Так, на цэнтральнай электрастанцыі імя Леніна заявы падалі 6 лепшых ударнікаў, якія маюць вялікі вытворчы стаж. На заводзе «Камінтэрн» паступіла 15 заяў, на гуце імя Домбаля — 16, на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская Перамога» — 22 заявы, на заводзе-камбінаце — 9 заяў. На радзе фабрык арганізаваны новыя ўдарныя брыгады імя Леніна.

БАГДАН.

У Р-скім ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНЫМ СТРАЛКОВЫМ ПАЛКУ у ленінскія дні была праведзена дэкада баявой работы. Байцы-ўдарнікі спаткалі сёмую гадавіну сьмерці Уладзімера Ільіча масавым уступленьнем у рады партыі. У парт'ячэйку аб прыёме ў партыю паступіла калектыўная заява ад усяго 4-га аддзяленьня кулямётнай клясы, ад ударнікаў палкавой школы паступіла 12 індывідуальных заяў, у гаспадарчай роце — 5 заяў, у артдыве—6 заяў, з іх 3 заявы паданы камандзірамі разьдзелаў і 2 — камандзірамі аддзяленьняў.

КАВАЛЁЎ.

НА МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫЦЫ на працягу ленінскіх дзён 57 рабочых-ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

ПАРТКОЎ.

Апартуністы, зрывалі рост

НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ТАМУ НАЗАД «ЗЬВЯЗДА» ПІСАЛА АБ ТЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАРЫВАХ І ПРАВА-АПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ, ЯКАЯ МЕЛА МЕСЦА Ў РАБОЦЕ ШЫРАЎНІЦТВА ВАРЫСАЎСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ. ГЭТА ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА НЕ МАГЛА НЕ АДБІЦЬ І НА ВЯРБОЎЦЫ Ў ПАРТЫЮ ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ.

ЗАМЕСТ СЫСТЭМАТЫЧНАЙ РАБОТЫ ПА ВЯРБОЎЦЫ Ў РАДЫ КП(б)Б ПЕРАДАВЫХ ПРАЛЕТАРАЎ, У РАДЗЕ ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ МЫ МАЕМ НЕДАПУСТЫМАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ НАВАТ ДА ТЫХ РАБОЧЫХ, ЯКІЯ САМАЦЕКАМ ІДУЦЬ У ПАРТЫЮ. У ПАРТКАЛЕКТЫВЕ ФАБРЫКІ «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» Ў РАСКАПАНЫХ АРХІВАХ ЗНОЙДЗЕНЫ ЗАЯВЫ РАБОЧЫХ АБ ПРЫЁМЕ Ў ПАРТЫЮ, ЯКІЯ ВАЛЯЛІСЯ ЗА ШАФАМІ ПА 9 МЕСЯЦАЎ. ПОДОБНЫЯ САМАЕ МЫ МАЕМ І Ў ВОЛЬНО ПАРТКАЛЕКТЫВУ ГУТЫ ІМЯ ДОМБАЛЯ. ТАМ ЗАЯВЫ МАРЫНУЮЦЦА ПА 4 І БОЛЬШ МЕСЯЦАЎ. ПА ГУЦЕ ІМЯ ДОМБАЛЯ НЯДАЎНА ВЫКЛЮЧЫЛІ З РАДОЎ ПАРТЫІ 7 КАНДЫДАТАЎ. ГЭТА ВЫРАЗНА ГАВОРЫЦЬ АБ ТЫМ, ШТО СЯРОД ПРЫНЯТЫХ НЕ ВЯЛОСЯ АБСАЛЮТНА НІЯКАЙ ВЫХАВАЧАЙ РАБОТЫ, ШТО КАНДЫДАТЫ Ў ЧЛЕНЫ ПАРТЫІ ЗУСІМ НЯ БЫЛІ ЎЦЯГНУТЫ Ў ПАРТЫЙНУЮ РАБОТУ.

НЯ ЛЕПШ АДНОСІЦЦА ДА ВЯРБОЎКІ Ў ПАРТЫЮ ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ І РК КП(б)Б, З ЯГО БОКУ МЫ ТАК САМА НАЗІРАЕМ ФАКТЫ, КАЛІ НЕКАТОРЫХ РАБОЧЫХ АФАРМЛЯЛІ Ў ПАРТЫЮ ПА 3-4 МЕСЯЦЫ.

НА НАРАДЗЕ САКРАТАРОЎ ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК САКРАТАР РК КП(б)Б САСНОЎСКІ НЯ ДАЎ ПАЛІТЫЧНАЙ АЦЭНКІ ГАНЕБНЫМ АДНОСІНАМ З БОКУ ПААСОБНЫХ КІРАЎНІКОЎ ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ ДА ВЯРБОЎКІ Ў ПАРТЫЮ ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ.

ПАДАНЫЯ ФАКТЫ ЛІШНІ РАЗ ДАКАЗВАЮЦЬ, ШТО КІРАЎНІЦТВА БАРЫСАЎСКАГА РАЙКОМУ НЯ СПРАВІЛАСЯ З АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕМ ЗАДАЧ ПАРТЫІ.

Д. Р.



Тав. БАГІНСКІ, рабочы мэханічнага аддзяленьня фабрыкі «Беларуска»; падаў заяву аб прыёме ў КП(б)Б.

Год бурнага росту

Год таму назад Бягомльская партарганізацыя налічвала ў сваіх радох 83 чалавекі. Рабочая праслойка ў арганізацыі ледзь дасягала 20 проц.

У выніку гадавой работы мы маем на сёньняшні дзень 207 чалавек. Рост іншоўгалоўным чынам, за лік калгасьнікаў, саўгасных рабочых і батракоў. Цяпер рабочая праслойка складае ўжо больш 40 проц. Жанчын у райпартарганізацыі было усяго 3, а зараз іх — 18 проц.

У партыю ідуць старыя калгасьнікі-актывісты. Так, ячэйкай КП(б)Б калгасу «На варцы» падаўна прынят у рады КП(б)Б былы батрак, арганізатар калгасу, тав. Мулярэў — 70 год. У сваёй заяве тав. Мулярэў гаворыць:

— Я шчыра ўзяўся за сваю кроўную справу, — выхаду з цемры, будаваньня калектыўнага жыцьця. Не магу застацца [illegible] партыі!

У калгасе вёшчы, размалая прыблізна такую-ж заяву была батрацка тав. Мацэвіч — 50 год.

Гэты калгас — буйнейшы ў раёне. Ён складаецца амаль выключна з батракоў і беднаты. Толькі ў апошнія часы, у сувязі з новым прыліванм, у яго сталі ўваходзіць і серадняцкія гаспадаркі. Так існуе кандыдацкая група ў 35 чалавек. У групе — шмат батрачак.

Жанчыны-калгасьніцы з «Усходу» ахвяруна працуюць на ўцягненьні ў калектыў аднасобнікаў з наўкольных вёсак. Яны арганізуюць спэцыяльныя вярбовачныя брыгады, выступаюць на калгасных агульных сходах, праводзяць індывідуальныя гутаркі.

Асаблівай адданасьцю і шчыльнымі вызначаюцца з «Усходу» т. т. Лукашэвіч Наста, Хацкевіч Алеся і Мацэвіч Уліта. Гэта дзякуючы іхняй рабоце стварыўся ў ленінскія дні новы калгас з 12-ці двароў у вёсцы Улесьсе — у тым самым глухім Улесьсі, да якога ніяк не маглі дабрацца ні рабіны, ні сельсаветскія прапаўнікі.

Побач з даволі буйнымі посьпехамі ў сэнсе колькаснага і якаснага росту Бягомльская партарганізацыя маюць чэсца і праяўленьні апартуністычнай небяспекі гэтага пытаньня. Зусім няма росту, напрыклад, у ячэйках калгасу «Чырвоны пагранічнік», у Асоўскай сельсавецкай і ў ячэйцы саўгасу «Камінтэрн».

Сакратар «Камінтэрнаўскай» парт'ячэйкі (у ячэйцы — 16 партыйцаў) імкнецца ўпэўніць, што:

— У нас маладыя рабочыя. За лікаго расьці? Ня варта рушыцца...

У раёне налічваецца каля 300 батракоў. Калі адкінуць 50 проц. моладзі камсамольскага ўзросту і тых, што ўваходзяць зараз у КП(б)Б, дык чалавек 100 яшчэ можна і трэба ўцягнуць у рады партыі. На гэтым пытаньні завяртрыў увагу апошні пленум РК.

Да ліку адмоўных бакоў трэба аднесьці яшчэ і незамаляваньне ў партыі кандыдатаў, неналаджанасьць унутрыпыхавачай работы сярод іх. Здараліся выпадкі, калі кандыдаты партыі выступалі супроць калектыўзацыі, самі разбазаравалі маемасьць (Асоўская ячэйка). Кандыдат у члены партыі Садко (з гэтай-жа ячэйкі), калі яму прапанавалі ўступіць у калгас, заявіў:

— Я толькі цяпер пачаў жыць... Даволі мяне мучыць! Чаго вы мяне гоніце ў калгас? Я вам аддам кандыдацкую картку, толькі не чапайце мяне.

Садко, зразумела, выключылі з партыі і зрабілі з яго справы палітычны урок для ўсёй партарганізацыі раёну.

Неадкладная задача Бягомльскай парт'арганізацыі — узмацніць плянавую, сыстэматычную работу з кандыдатамі ў члены партыі.

Трэба сказаць, што раённая газэта «Калгасны змагар» пачала актыўна змагацца за рост партыі.

Юр. Л—ны.

Наперакор дырэктывам партыі

У КАСЬЦЮКОВІЦКІМ РАЁНЕ ШМАТ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ РАБОЧЫХ, СТАРЫХ КАМУНАРАЎ І БАТРАКОЎ. АДНАК, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ВЯЛІКУЮ БАЗУ ДЛЯ РОСТУ, РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ РАСЛА ВЕЛЬМІ ПАВОЛЬНА, І ГОРШ ЗА ЎСЁ ТОЎ, ШТО ПРЫРОСЬЦЕ НЕ ЗАВЯСЬПЕЧАЛ ПРЫЕМ 40 ПРОЦ. РАБОЧЫХ І БАТРАКОЎ СЯРОД АГУЛЬНАГА ЛІКУ ЗАЦЬВЯРДЖАНЫХ ЗА МІНУЛЫ ГОД БАТРАКІ І С.-Г. РАБОЧЫЯ СКЛАДАЮЦЬ ТОЛЬКІ 11 ПРОЦ., А ЖАНЧЫНЫ—ТОЛЬКІ ПРОЦ.

ХАРАКТЭРНА ПАДКРЭСЬЛІВАЕ ТОЕ, ШТО НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА РАЗ КАТЭГАРЫЧНЫХ ДЫРЭКТЫЎ З БОКУ ВЫШЭЙШЫХ ПАРТОРГАНАЎ КАСЬЦЮКОВІЦКАЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ Ў 1930 Г. НЯ ТОЛЬКІ НЕ РАЗВІВАЛА РОСТУ, А НАВАТ ЗМЕНШЫЛА ЯГО ПАРАЎНАЛЬНА З 1929 ГОДАМ НА 15,3 ПРОЦ. САМЫЯ БУЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ Ў РАЁНЕ, ЯК КАСЬЦЮКОВІЦКАЯ, КАНІЦКАЯ, ЗАБЫЧАНСКАЯ, ПРУСЕНСКАЯ, ДЗЯМІДАЎСКАЯ І ВАЛЬНКАВІЦКАЯ ЗА АПОШНІ ГОД НЕ ПРЫНЯЛІ Ў СВАЕ РАДЫ НІ АДНАГО ЧАЛАВЕКА. СТАЎШЫ НА АПАРТУНІСТЫЧНЫ ШЛЯХ РАЗВАЖАЎНЫЯ ПААСОБНЫЯ КІРАЎНІКІ ГЭТЫХ ЯЧЭЕК АДМАЎЛЯЛІ НАЯВНАСЬЦЬ БАЗЫ ДЛЯ РОСТУ І ГЭТЫМ ІМКНУЛІСЯ ПРЫКРЫЦЬ СВАЮ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ ПЕРАРОСТУЮ Ў АПАРТУНІЗМ НА ПРАКТЫЦЫ.

КАСЬЦЮКОВІЦКІ РАЙКОМ ПАРТЫІ ПАВІНЕН НЕАДКЛАДНА АБМЕРКАВАЦЬ ПЫТАНЬНЕ РОСТУ І МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЮ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЮ ВОКОЛ ЗАДАЧ РАЗГОРТВАНЬНЯ ВЯРБОВАЧНАЯ РАБОТЫ.

З.

8-9 ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У МЕНГАРСАВЕТ

ГАРСАВЕТ— УДАРНАЯ БРЫГАДА сацыялістычнага наступленьня

Пасылаючы ў савет XIII скліканьня лепшых рабочых-ударнікаў, пралетары г. Менску дэманструюць сваю гатоўнасьць змагацца за выкананьне пляну трэцяга году пяцігодкі, за павышэньне ролі саветаў у правядзеньні генэральнай лініі партыі

Спробы апартуністаў і клясава-варожых элемэнтаў скарыстаць перавыбары ў сваіх інтарэсах пацярпелі жорсткае паражэньне

Усе сілы, усю энэргію— на выкананьне задач 3-га рашаючага

Арганізаванымі парадкам прышлі на выбарчы сход работнікі Дзяржбанку, ашчадкасы, Белкамунбанку, дзяржстраху, Наркамфіну і курсаў НКФ. Пры адкрыцьці сходу выявілася, што, некаторая частка выбаршчыкаў не атрымала пазваў у прыватнасьці не перадала каля 20 позваў выбаршчыкам з курсаў НКФ.

На сход зьявілася 74 проц. агульная колькасьці выбаршчыкаў, якія лічацца ў сьпісках гарадзкой камісіі.

Прапанова аб выбары ў гапаровы прэзыдыум усяго складу Палітбюро ЦК УсеКП(б) спаткана гучнымі воплескамі.

У пакаа паступіла 30 далатка ў:

— Пабудаваць камунальныя купальні;

— Асьвятліць гарадзкія сады;

— Палепшыць станоўнішча сталовых;

— Нападзіць кантроль за рамонтам дамоў ЖАКТ'аў;

— Пры пабудове новых дамоў прадугледзець мерапрыемствы па супрацьгазавай абароне.

У гарадзкі савет выбраны: Вольпава — работніца НКФ, вылучэнка. Дабравольскі — работнік галоўнага кіраўніцтва ашчадкас, рабочы-вылучэнец. Бунін — нам. наркамфіна і Фэльдман — кіраўнік Дзяржбанку. Кандыдатамі выбраны [illegible] вылучэнцы — Лонскі і [illegible] трэцяга рашаючага [illegible]

К. Г.

Прышоў увесь калектыў

Фабрыка „Беларуска" добра падрыхтавалася да перавыбараў

На працягу некалькіх дзён вялася ўзмоцненая падрыхтоўка да перавыбарчага сходу на ГАЛЯНТАРЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ «БЕЛАРУСКА». Шматлікія плякаты і лёзунгі крычалі аб надыходзячым сходзе, заклікалі да актыўнага ўдзелу ў перавыбарах, да 100 процантнай яўкі. Літаральна ўся фабрыка жыла перавыбарамі.

26 студзеня а 3 гадзіне дня фабрычны гудок абвясьціў аб пачатку сходу.

Прышло 378 чалавек. Павінна было прыйсьці... 378.

100 ПРОЦ. ЯЎКІ.

Рабочыя патрабавалі, каб гарсавет павярнуўся тварам да прадпрыемства, каб ён важнейшыя мерапрыемствы абмяркоўваў на рабочых сходах, каб кіраваў палітэхнізацыяй школ, падзіў кантроль над работай [illegible] садзейнасьці дзяцрабочы, партызан, [illegible]

Звыш [illegible] за ўдарную работніца-ўдарніца КУДАК і тав. МІРУЦ—старшыня ЦП саюзу дрэвапрацоўшчыкаў, кандыдатам выбран тав. Якельчык.

Масьлянскі. Агранаў.

Новая электрастанцыя і другі хлебазавод— важнейшыя аб'екты будаўніцтва 1931 г. у Менску

Амаль ва ўсіх наказах Менскаму гарсавету 13-га скліканьня фігуруе пункт: «У 1931 годзе прыступіць да пабудовы новай электрастанцыі і хлебазаводу».

Рабочым-ударнікам, якіх пралетары гор. Менску пасылаюць у гарадзкі савет, катэгарычна прапануюцца: ва што-б там ні стала ажыцьцявіць гэтыя пункты.

І сапраўды, будаўніцтва такіх двух буйных аб'ектаў, як электрастанцыя і хлебазавод, выклікана патрабаваньнямі самога жыцьця, ростам насельніцтва гораду, ростам яго прамысловасьці і пралетарскіх кадраў.

Ужо зараз існуючая электрастанцыя не здавальняе запатрабаваньняў Менску ў электраэнэргіі. Навет і цяпер, пасьля ўстаноўкі новай турбіны, станцыя працуе з празьмернай нагрузкай, ня можа задаволіць вялікага попыту на электрычнасьць. 5 тысяч новых абанэнтаў гэта пязначны прыпант таго ліку рабочых, якія—адчуваюць патрэбу ў электрычнасьці.

Сталі больш частымі выпадкі спыненьня трамваю з-за недахвату электраэнэргіі. Даволі часта бываюць перабоі ў забесьпячэньні энэргіяй гораду і прамысловасьці. [illegible] выклікі.

Асабліва пяжкаецьць па акраінах, акраіны вострая адчуваюць вынікі пяжкага становішча энэргетычнай гаспадаркі гораду.

Ужо ў 1932 годзе Менская электрастанцыя ня зможа задаволіць попыту прамысловасьці гораду, якая разьвіваецца з кожным днём.

У будучым годзе дэфіцыт электраэнэргіі будзе складаць каля 1.500 клв.

Пашырэньне энэргетычнай базы—вострая праблема, якую трэба абавязкова вырашыць. У паралак дня пастаўлена пытаньне аб пабудове новай электрастанцыі. Трэба ўлічыць і тое, што гэта пабудова дасьць вялікую эканомію ў апале, паколькі можна будзе скарыстаць адходы пары станцыі.

* * *

Ня менш важным пытаньнем зьяўляецца пабудова новага хлебазаводу. Чарга ля хлебных крам не ліквідавана. Бываюць дні, калі чарга значна павялічваецца. Ёсьць выпадкі, калі ў крамах МЦРК зусім няма хлеба. Прычына—слабая ёмістасьць хлебазаводу. Максымальная выпрацоўка заводу—60 тон у дзень—не здавальняе патрабаваньняў гораду. 40 тон даюць саматужныя хлебапякарні, якія час ужо здаць у архіў. З-за перагрузкі заводу і пякарань бываюць частыя прастоі на рамонт, якія выклікаюць перабоі ў забесьпячэньні гораду хлебам. Дырэктывы аб стандартызацыі выпечкі, аб паляпшэньні якасьці хлеба па выкананы.

Насельніцтва гор. Менску расьце з кожным днём. Прамысловасьць пашыраецца, у вытворчасьць улічацца новыя кадры.

У 1932-33 годзе бязумоўна хлебазавод зусім ня зможа задаволіць [illegible] хлебазавод.

Л—ч.

Старэйшых рабочых-ударнікаў—у дэпутаты

Чатыры невялікія калектывы сабраліся на выбарчы сход у клюбе харчавікоў: каўбасная фабрыка, малочны завод, калектыў Белмяса і птушачна-адкормачны пункт. Зьявілася 83 проц. выбаршчыкаў.

З-за слабай патрыхтоўкі да сходу і невыстарчальнай папярэдняй працоўкі накалу актыўнасьці выбаршчыкаў была кепска разгорнута. Паступіла толькі 10 назначных далатка ў.

У дэпутаты выбраны: стары рабочы каўбаснай фабрыкі з 22-гадовым рабочым стажам, прамяніны ўдарнік, член КП(б)Б—тав. Сарфус; старэйшая работніца малочнага заводу з 32-гадовым рабочым стажам, прозіваная ўдарніца, член КП(б)Б—тав. Дрэйцэр; кандыдатам выбрана работніца-ўдарніца—тав. Сіманковіч.

Брыгадзір «Зьвязды» Агранаў.

Больш 100% яўкі

Рабочыя-абутнікі абавязаліся поўнасьцю выкаць прамфінплян

На выбарчы сход рабочых ДРУГОЙ ЗЬМЕНЫ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ прышло 270 чалавек. Павінна было прыйсьці 220 чал. Начэкана зьявіліся адпускныя, выхадныя і навет тыя, што мелі бюлетэнь па хваробе.

Наказ гарсавету абгаворваўся вельмі жвава і актыўна; 65 дадаткаў да наказу — уклад рабочых абутковай фабрыкі.

Выбаршчыкі патрабавалі ад гарсавету кіраваць выкананьнем задач трэцяга году пяцігодкі, быць арганізатарам сацспаборніцтва і ўдарніцтва, часьцей рабіць справаздачы перад выбаршчыкамі з тым, каб пры дапамозе рабочых выпраўляць памылкі. З свайго боку рабочыя абутковай фабрыкі абяцалі падтрымліваць сваіх дэлегатаў, выкананць прамфінплян рашаючага году пяцігодкі.

У адзнаку перавыбараў і пенінскіх дзён 50 рабочых — лепшых [illegible] прыправу Леніна — падалі [illegible] ёме ў партыю.

[illegible] фабрыкі даверылі Рабочыя [illegible] таў сваім лепшым ударнікам Ванькевіч, Сіжынскаму, Касоўскаму, а таксама дырэктару фабрыкі — Плаўніку і тав. Камэнштайну (ЦСПСБ).

Л.

Менск, друкарня [illegible]

Кваліфікаваныя кадры—сацыялістычнаму транспарту

Сваячасова і выразна выканаць дырэктывы партыі

Пастанову СНК і ЦК УсеКП(б)—у масы

УЧОРА АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭНЬНЕ МЕНСКАГА СТАНЦЫЙНАГА ПРАФКАМІТЭТУ. НА ПАСЯДЖЭНЬНІ БЫЛА АБМЕРКАВАНА АДОЗВА СНК СССР І ЦК УсеКП(б) ЗА ПОДПІСАМІ Т. Т. МОЛАТАВА І СТАЛІНА АБ ПЕРАБУДОВЕ РАБОТЫ НА ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРЦЕ.

ПАСЬЛЯ АБМЕРКАВАНЬНЯ КАМІТЭТ ПАСТАНАВІЎ ПРАВЕСЬЦІ НАСТУПНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ:

— НЕАДКЛАДНА АБМЕРКАВАЦЬ ПАСТАНОВУ НА ПАШЫРАНЫМ ПАСЯДЖЭНЬНІ ПРАФАКТЫВУ.

— ПРАПРАЦАВАЦЬ ПАСТАНОВУ У ЦЭХАХ, ЗЬМЕНАХ І БРЫГАДАХ.

— У МЭТАХ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ПАСТАНОВЫ СТАНЦЫЙНЫ КАМІТЭТ ПАРАШЫЎ НАДРУКАВАЦЬ ЯЕ АСОБНАЙ КНІЖКАЙ У КОЛЬКАСЦІ 3 ТЫС. ЭКЗ. І РАЗДАЦЬ КОЖНАМУ РАБОЧАМУ.

А.

Яшчэ не раскачаліся

Праблема кадраў для транспарту зьяўляецца першачарговай задачай. Таму пастановы ЦК УсеКП(б) і Наркамправы Саюзу ад 16 студзеня аб зваротце былых чыгуначнікаў на транспарт набываюць вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне. Але, на гледзячы па выразныя дырэктывы, ні транспартныя ўстановы і прадпрыемствы, ні прафсаюзныя арганізацыі амаль нічога яшчэ не зрабілі.

Транспартныя арганізацыі да гэтага часу не падрыхтаваліся да прыёму кваліфікаванай рабочай сілы і спэцыялістаў, якія прыдуць да іх гэтымі днямі. Транспартныя арганізацыі яшчэ ня ведаюць, дзе, колькі і якой кваліфікаванай рабсілы ім патрэбна. Калі Наркамправы дні два таму назад зьвярнуўся да апарату ўпаўнаважанага Наркамату Шляхоў Зносін з запытаньнем, куды накіроўваць людзей (паколькі мясцовыя органы працы ўжо шлюць тэлеграмы з паведамленьнямі аб скаканьні ўліку чыгуначных работнікаў), дык у апараце ўпаўнаважанага аказалася толькі адна заяўка з Воршы.

У зьвязку з гэтым Наркамправы БССР склікае 2-га лютага нараду начальнікаў райнаў чыгункі з тым, каб добра прапрацаваць пытаньне аб заяўках.

Прафсаюзныя арганізацыі таксама яшчэ не раскачаліся. Задача прафсаюзных арганізацый правесьці шырокую грамадзкую работу на прадпрыемствах і па ўстановах па хутчэйшым выяўленьні чыгуначнікаў і спэцыялістаў, растлумачыць прычыны звароту кваліфікаванай рабсілы на чыгунку. Транспартныя прафарганізацыі павінны забясьпечыць арганізаваную сустрэчу былых чыгуначнікаў, рацыянальнае іх размеркаваньне, падрыхтаваць пытаньне аб забесьпячэньні іх жыльлёва-бытавымі ўмовамі.

Транспартныя прафарганізацыі павінны зараз-жа прапрацаваць заяўкі па рабсілу і выявіць сапраўдную патрэбу ў ёй, аб чым паведаміць органы працы.

Баявая задача таксама ўскладзена на органы працы. Яны павінны, як мата хутчэй, выявіць з дапамогай прафсаюзных арганізацый кваліфікаваныя кадры чыгуначнікаў, забясьпечыць сваячасовае накіраваньне іх у арганізаваным парадку на пункты работы, рашуча змагаючыся з усімі перашкодамі і тормазамі ў гэтай рабоце. Яны павінны неадкладна дабіцца выразных заявак транспартных арганізацый на патрэбную кваліфікаваную рабсілу і спэцыялістаў. Трэба неадкладна арганізаваць брыгады для выяўленьня кадраў былых чыгуначнікаў і спэцыялістаў, а таксама правесьць транспартныя арганізацыі ў сэнсе іх падрыхтаванасьці для арганізаванага спатканьня чыгуначнікаў.

Уся работа па выкананьні дырэктыў партыі і ўраду ў гэтай галіне павінна быць праведзена па-баявому і ў вызначаныя тэрміны.

З.

Там, дзе рыхтуюцца кадры

МЕНСКАЯ ШКОЛА ВУЧНЯЎСТВА МВБ ЧЫГ. ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДНЭЙ З БУЙНЕЙШЫХ ШКОЛ БССР ДЗЕ РЫХТУЮЦЦА РАБОЧЫЯ КАДРЫ ДЛЯ ТРАНСПАРТУ. ЗА АПОШНІЯ ГАДЫ ШКОЛА ЗНАЧНА ПАШЫРЫЛАСЯ. КАЛІ Ў 1923 Г. Ў ЕЙ БЫЛО 90 ВУЧНЯЎ, А Ў 1929 Г. — 204 ЧАЛ., ДЫК У 1930 Г. У ШКОЛЕ НАЛІЧВАЕЦЦА ЎЖО 522 ЧАЛ., З ЯКІХ 37 ЖАНЧЫН.

ШКОЛА РЫХТУЕ 24 ПАМОЧНІКАЎ МАШЫНІСТАЎ, 58 ПАРАВОЗНЫХ СЬЛЕСАРАЎ, 64 ВАГОННЫХ СЬЛЕСАРАЎ, 39 ІНСТРУМАНТАЛЬШЧЫКАЎ, 102 КАВАЛЕЎ, 18 КАЦЕЛЬШЧЫКАЎ, 36 ТАКАРОЎ ПА МЭТАЛІ І 91 ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКА.

ПАВОДЛЕ ВЫТВОРЧАГА ПЛЯНУ МЯРКУЕЦЦА ЎСЮ ГЭТУ МАСУ ВУЧНЯЎ ПАДРЫХТАВАЦЬ І ПЕРАДАЦЬ ТРАНСПАРТУ НЕ ПАЗЬНЕЙ КАНЦА 1931-32 НАВЧАЛЬНАГА ГОДУ, ПРЫЧЫМ ПЕРШЫ ВЫПУСК ВЫЗНАЧАН НА 1931 Г.—У РОЗНЫЯ ТЭРМІНЫ.

У МІНУЛЫМ РАБОТА ШКОЛЫ КУЛЬГАЛА НА АБЕДЗЬВЕ НАГІ, ПРАЦДЫСЦЫПЛІНА БЫЛА Ў ЗАНЯПАДЗЕ, БЫЛО ШЫРОКА РАЗВІТА ХУЛІГАНСТВА, П'ЯНСТВА І Г. Д. АЛЕ Ў СУЧАСНЫ МОМАНТ ШКОЛА ЛІКВІДУЕ ЎСЕ ПРАРЫВЫ І НЕДАХОПЫ.

УСЯ РАБОТА ШКОЛЫ ПЕРАВОДЗІЦЦА НА РЭЙКІ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА. І ГЭТА ДАЕ НАДЗЕЮ, ШТО ВЫТВОРЧЫ ПЛЯН ШКОЛЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ КАДРАЎ ДЛЯ ТРАНСПАРТУ БУДЗЕ ВЫКАНАН.

ШКОЛА АДЧУВАЕ ВЯЛІКІ НЕДАХВАТ У МАТАР'ЯЛАХ (ЖАЛЕЗА, СТАЛЬ, ДРЭВА), ШТО ТАРМОЗІЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ВЫТВОРЧЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ ПЛЯНАЎ. РАЁННАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ НА ПАТРАБАВАНЬНІ ДАЦЬ МАТАР'ЯЛЫ АБМЯЖОЎВАЕЦЦА БЮРАКРАТЫЧНЫМІ АДПІСКАМІ.

Л. А. ЗАРЭЦКІ.

Задача сёнешняга дня

За апошні час партыя вывесла рад пастановаў, накіраваных на паляпшэньне работы спажывецкай кааперацыі і на ліквідацыю выкарчоўваньне буйнейшых недахопаў, якія маюць мейсца ў яе рабоце.

Партыя, уся пралетарская грамадзкасьць патрабуюць ад спажывецкай кааперацыі выразнага і хуткага вырашэньня задач, зьвязаных з праблемай рабочага забесьпячэньня, а перадусім перабудовай работы спажывецкай кааперацыі.

Асноўнымі пытаньнямі, за поўнае вырашэньне якіх мы павінны зараз узяцца з усёй сілай,—зьяўляюцца:

Першае: НЕАДКЛАДНАЕ ПАЛЯПШЭНЬНЕ ЎСЕЙ РАБОТЫ ПА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ ВАЖНЕЙШЫХ БУЙНЕЙШЫХ ЎЧАСТКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, ПА АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЮ ПРЫНЦЫПАЎ КЛЯСАВАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ, ЯК У ГОРАДЗЕ, ТАК І НА ВЕСЦЫ. Важнейшым фактарам у гэтых адносінах зьяўляюцца закрытыя рэзьмеркавальнікі, увага да якіх павінна быць зараз узмоцнена як ніколі.

У адпаведнасьці з гэтым мы павінны зараз-жа вярбіць разьбіўку прадпрыемствам зваротку БССР на асобных катэгорыях забесьпячэньня з тым каб усе рабочыя важнейшых галін прамысловасьці БССР былі забясьпечаны павышанымі нормамі забесьпячэньня. Павышаныя нормы забесьпячэньня павінны быць ня толькі для самога рабочага, але і для членаў яго сям'і. Прадпрыемствы, якія ня маюць рашаючага значэньня і адносяцца да 3 катэгорыі, ня будуць карыстацца павышанымі нормамі. Трэцяя катэгорыя будзе мець нормы сталага прадукту першай патрэбы непахісна паменшаную.

Разьбіўка прадпрыемстваў па катэгорыях (1, 2 і 3) у цяперашні момант скончана. Асноўная задача зараз—давесьці ў кожным ЦРК такой выразкі ў разьмеркаваньні фондаў, пры якой было-б поўнасьцю забясьпечана ажыцьцяўленьне дырэктывы пленуму ЦК КП(б)Б аб першачарговым забесьпячэньні рабочых важнейшых галін прамысловасьці. Разьбіўка прадпрыемстваў па катэгорыях і ўстанаўленьне асобных норм забесьпячэньня для кожнай катэгорыі—вышэйшай, сярэдняй, ніжэйшай патрабуюць неадкладнага правядзеньня шырокай растлумачальнай працы сярод рабочых мас аб значэньні гэтага на сутнасьці кожнага парадку забесьпячэньня.

Другая задача: НЕАДКЛАДНАЕ І РАДЫКАЛЬНАЕ ПАЛЯПШЭНЬНЕ СПРАВЫ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ. Да гэтага часу гэтая справа пастаўлена несур'ёзна. Таму намі павінна быць праведзена таксама строгая дыферэнцыяцыя грамадзкага харчаваньня пад кутом погляду першачарговага і лепшага забесьпячэньня прадуктамі харчаваньня пры прадпрыемствах закрытых сталовак на прадпрыемствах з тым, каб гэтыя сталовыя былі поўнасьцю забясьпечаны цьвёрдымі фондамі, інвэнтаром, абсталяваньнем і г. д. Трэба зараз-жа пераглядзець унесь пункт загадчыкаў сталовымі, выявіўшы іх прыгодасьць, каб сапраўды паставіць работу сталовак на належную высыню, трэба зьнішчыць агідные і антысанітарные становішча, дабіцца паляпшэньня работы самога абслугоўваючага персаналу, зьнішчэньня грубасьці ў сталовых, паляпшэньня якасьці абслугі, эканомнага выдаткаваньня прадуктаў і г. д. Трэба па-чым-бы там ні стала дабіцца разгортваньня на прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня лёзунгу сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Адным з важнейшых прадпрыемстваў павінны быць неадкладнае арганізацыйная перабудова ўсёй справы грамадзкага харчаваньня. Трэба сьмела і рашуча правесьці ў жыцьцё вылучэньне грамадзкага харчаваньня ў самастойную гаспадарчую адзінку.

Трэцяя задача—гэта в усей сілай быць за ажыцьцяўленьне пастаноў партыі па разгортваньні ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК. Для гэтай мэты нам трэба сканцэнтраваць выключную ўвагу на выкананьне праграмы на засеку 5.000 гэктараў гародных культур, адкорме 60 тысяч сьвіней, даяданьні малочнага стада да 12 тыс. галоў, даяданьні парніковых гаспадарак да 50 тыс. рам. Трэба зараз на гэту работу кінуць лепшых работнікаў з апаратаў кааперацыі, сканцэнтраваўшы ўвагу на падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі. Трэба зараз, каб кожны ЦРК сачыў за тым, каб такія пытаньні, як набыцьцё пасевіва, забесьпячэньне цагавай сілай, рамонт с.-г. інвэнтару, вывазка гною, камплектаваньне рабочай сілай—былі-бы ў цэнтры ўвагі ўсёй работы данага ЦРК. Тут павінны быць распрацаваны такія баявыя тэмпы, якія-б пераламалі ўсю пасыўнасьць, апартуністычную практыку, якія яшчэ даволі моцны ва ўсіх кааперацыйных арганізацыях.

Чацьвёртая задача—ГЭТА ХУТКАЕ І РАШУЧАЕ ЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМУ ЦК АБ ПЕРАБУДОВЕ ЎСЁЙ СЕТКІ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЕРАЦЫІ. Тут патрэбна—максымум, да 10 лютага—скончыць адпаведнае транспартнай кааперацыі, перадача ёй усіх неабходных прадпрыемстваў, сродкаў і г. д., якія ў свой час перайшлі ад транспартнай кааперацыі—ЦРК і ўсіх прадпрыемстваў і крамной сеткі, якія былі арганізаваны для абслугоўваньня рабочых-транспартнікаў, ні ў якім разе не парушаючы—да поўнай арганізацыі ТСА—нармальнага забесьпячэньня рабочых-чыгуначнікаў.

Таксама—на працягу, максымум, месячнага тэрміну—трэба правесьці і скончыць работу па арганізацыі закрытых рабочых кааператываў пры прадпрыемствах на зусім самастойнай падставе, са сваёй самастойнай фінансавай гаспадаркай, уласнай сеткай крам, сталовых, прыгарадных гаспадарак, адкормачных пунктаў, малочных фэрм.

Ва ўмовах БССР мы павінны дапускаць стварэньне аднаго закрытага рабочага кааператыву для двух аднародных прадпрыемстваў. У даным выпадку, напрыклад у Менску, можна і трэба арганізаваць самастойны закрыты рабочы кааператыў для заводу «Энергія» і заводу «Камунар». Дыялёгічнае гэтаму пленуму ЦК абавязваў сыстэму спажывецкай кааперацыі прыняць усе меры да ўзмаўненьня фінансавай гаспаладкі, устанаўленьня суровага фінансавай дысцыпліны, недапушчэньня выдаткаваньня сродкаў па-за ліку і г. д. Гэта дырэктыва пленуму, павінна быць выкананa безагаворачна.

Ход мабілізацыі сродкаў за студзень месяц паказвае яўна апартуністычныя адносіны да гэтага важнейшага пытаньня. Плян узнакаленьня выканан усяго ў разьмеры 36 проц., таваарныя рэшткі заместь зьніжэньня—павялічваюцца. Гэта сыгналы, якія патрабуюць неадкладных і рашучых мер. Адсюль вывад—патрэбна рашучая баявая дзейнасьць ўсёй сыстэмы ва ўсёй фінансавай работе. Ажыцьцяўленьне гэтай важнейшай задачы ня церпіць найменшага замаруджваньня.

Пастановы пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і пленуму ЦК КП(б)Б павінны стаць праграмай баявой дзейнасьці ва ўсёй рабоце спажывецкай кааперацыі.

ХАСКІН.

Месячнік лесазагатовак

ЛЕСАЗАГАТОЎКІ—ПАД УДАРАМ

Праваапартуністычная недаацэнка лесазагатовак зрывае выкананьне лесазагатоўчай праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі

СЫСТЭМАТЫЧНАЙ ПРАВЕРКАЙ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ, НАНЯСЕНЬНЕМ РАШУЧАГА АДПОРУ КУЛАЦКАЙ АГІТАЦЫІ І ПРАЯВАМ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫКІ—ВЫКАНАЕМ ПАСТАНОВЫ ПАРТЫІ І УРАДУ, ЗАБЯСЬПЕЧЫМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА ЛЕСАМАТАР'ЯЛАМІ

Лесазагатоўкі—баявыя тэмпы

Матар'ялы, паступаючыя з месц, сыгналізуюць аб тым, што на радзе лесазагатоўчых вучасткаў ёсьць глыбокія прарывы, асабліва ў галіне вывазкі.

Гэта тлумачыцца, па-першае, тым, што апараты леспрамгасаў яшчэ і да сёнешняга дня не пераключыліся на баявыя, сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы.

Паасобныя мясцовыя партарганізацыі не правяраюць выкананьня дырэктыў партыі і тых дырэктыў, якія даюцца самой партарганізацыяй, у горным выпадку некаторыя з іх зусім не займаюцца ляснымі справамі.

Хойніцкі райком партыі на прапяту апошніх 6-7 месяцаў пытаньнямі лесазагатовак не займаўся. Райком ня цікавіўся тым, што ў Хойніцкім леспрамгасе прарыў у загатоўках і вывазцы з дня на дзень паглыбляецца.

Борканіцкі райком партыі толькі ў канцы сьнежня заслухаў пытаньне заготовак, дзе канстатаваў, што выкананьне лесазагатоўчых плянаў сарвана, і тлумачыць гэта становішча тым, што адсутнічалі ўдарныя тэмпы работы, што ў мясцовых нізавых арганізацыях была праваапартуністычная стаўка на самацёк.

Але... далей гэтай пастаноўчы райком не пайшоў.

Гэта-ж самае мы бачым і па Прапойскім і Полацкім райкомах КП(б)Б.

Вакол пытаньняў лесазагатовак ня склалазена грамадзкай думкі. Масы калгасьнікаў, беднаты і серадняковы не мабілізаваны на выкананьне і перавыкананьне плянавых заданьняў. Ва многіх мясцох няма жорсткай і бязьлітаснай барацьбы з кулацка-заможнай часткай вёскі, якая ўпарта імкнецца сарваць лесазагатоўчыя пляны.

Работа сярод рабочых лесарубаў і возчыкаў не праводзіцца. Бярэзінскі райком КП(б)Б так і канстатуе, што прафарганізацыі ў разгортваньні палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай работы нізкага ўдзелу ня прымаюць. Дрэннае становішча і з забесьпячэньнем рабочых прадуктамі харчаваньня і фуражом.

Есьць выпадкі, калі замест прапагандзяньня культ-масавай і растлумачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкай часткі вёскі і рабочых лесарубаў, з тым, каб мабілізаваць іх на выкананьне плянавых заданьняў, лесазагатовак і вывазкі, ужываліся метады адміністраваньня, як гэта мела месца ў Бярэзінскім раёне.

Чым тлумачыць той факт, што да апошняга часу ня былі ў большасьці раёнаў раздзелены цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможных двароў на вывазцы лесаматар'ялаў і дроў?

Тым, што многія мясцовыя партыйныя арганізацыі недаацэньваюць палітычнай важнасьці барацьбы за выкананьне лесазагатоўчых плянаў, што ў радзе мясцовых арганізацый усю работу на лесазагатоўчым фронце ўсклалі на плечы леспрамгасаў, якія не заўсёды праводзяць выразна клясавую лінію. Няма рашучага націску на кулакоў.

Бярэзінскі райком партыі, даючы дырэктыву аб лесазагатоўках чарт'ячэйкам і фракцыі райвыканкому, ні слова не сказаў аб даваўленьні цьвёрдых заданьняў да кулацкіх двароў. Больш таго, райком у сваёй дырэктыве пісаў: «Працуючы ў лесазагатоўках няма, а таму насельніцтва да загатовак і вывазкі лесу прыцягваецца ў парадку вярбоўкі і самазабяспячэньства» (?!). Райком, бачыце, зусім «забыўся», што побач з бядняцка-серадняцкай часткай вёскі ёсьць заможная кулацкая частка і кулакоў. Кулакі «выпалі» з дырэктывы Бярэзінскага райкому партыі.

Камсамольскія арганізацыі, аб чым ужо многа раз сыгналізавала «Зьвязда», зусім слабы ўдзел прымаюць у выкананьні лесазагатоўчых плянаў. Пастанова ЦК ЛКСМБ аб пасылцы 1.000 лесарубаў-камсамольцаў усё яшчэ ня выканана.

Задача партыйных арганізацый безадкладна перайсьці ад фармальных пастаноў і дырэктыў да практычнага вырашэньня плянаў лесазагатовак.

Сыстэматычна правяраючы выкананьне лесазагатоўчых плянаў, даючы рашучы адпор кулацкай агітацыі і ўзяўшы правям праваапартуністычнай практыкі, неабходна па-бальшавіцку ўзяцца за выкананьне лесазагатоўчых плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Месячнік не распачынаўся

ПЛЯН ВЫВАЗКІ САРВАНЫ

НЕМАН, 29. (ПА ТЭЛЕФОНУ). ВЕСТКІ АБ ХОДЗЕ ЛЕСАЗАГАТОВАК У НЕМАНСКІМ ЛЕСАПРАМГАСЕ ПРЫМУШАЮЦЬ БІЦЬ ТРЫВОГУ.

АБВЕШЧАНЫ ПАРТЫЯЙ І ЎРАДАМ УДАРНЫ МЕСЯЧНІК ЛЕСАЗАГАТОВАК ЯШЧЭ НЕ РАСПАЧЫНАЎСЯ.

ЗА 29 ДЗЁН СТУДЗЕНЯ КВАРТАЛЬНАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА ЗАГАТОЎКАХ ДЗЕЛАВОЙ ДРАЎНІНЫ ВЫКАНАНА НА 9,8 ПРОЦ., ПА ЗАГАТОЎКАХ ДРОЎ —НА 8,7 ПРОЦ.

ПЛЯН ВЫВАЗКІ ФАКТЫЧНА САРВАНЫ. ДЗЕЛАВОЙ ДРАЎНІНЫ ЗАМЕСТ 288.300 КУБАМЭТРАЎ ВЫВЕЗЕНА ЎСЯГО... 4.634 КУБАМЭТРЫ. ДРОЎ ВЫВЕЗЕНА 253 РАЎМЭТРЫ ЗАМЕСТ... 60.750 РАЎМЭТРАЎ.

КУЛІК.

Квартальная праграма—пад пагрозай звыву

ГЛУСК, 29. (Па тэлефону). Абвешчаны месячнік лесазагатовак ніякага зруху ў выкананьні лесазагатоўчых плянаў не арабіў.

Квартальная праграма 1931 г.—пад пагрозай зрыву.

За дзьве дэкады на Глускім леспрамгасе загатоўлена дзелавой драўніны замест 155.400 кубамэтраў толькі 13.011 кубамэтраў, дроў—замест 192.900 раўмэтраў, усяго толькі 2.206 раўмэтраў.

Пляны па вывазцы дзелавой драўніны выкананы на 2,3 проц., па вывазцы дроў—на 3,7 проц.

Большасьць сельсаветаў проста, ня выконваюць даных заданьняў па лесазагатоўках і вывазцы. Націску на кулацка-заможную частку вёскі няма. Камсамол ня цікавіцца становішчам работы на лесазагатоўчым фронце.

САЙКІН.

Хойнікі ганебна адстаюць

ХОЙНІКІ, 29. (Па тэлефону). Хойнікі леспрамгас ушесь час ганебна цягнецца ў хвасьце замест большавіцкага выкананьня лесазагатоўчых плянаў.

Абвешчаны ўрадам месячнік лесазагатовак зусім ня цікавіць работнікаў Хойніцкага леспрамгасу.

Партыйная арганізацыя лесазагатоўкамі не займаецца. Райвыканком і асабліва сельсаветы бяздзейнічаюць.

Цьвёрдыя заданьні па вывазцы да кулацка-заможнай часткі вёскі не даведзены. Калгасы, узяўшы абавязельствы на вывазку лесаматар'ялаў і дроў, нічога не зрабілі.

У выніку такой работы квартальнае заданьне 1931 г. па загатоўцы дзелавой драўніны выканана на 15,1 проц., на загатоўцы дроў—на 0,1 проц.

З лесу вывезена дзелавой драўніны замест 100.300 кубамэтраў толькі... 3.613 кубамэтраў, дроў—замест 186.780 раўмэтраў, толькі... 9.519 раўмэтраў.

Партыйныя ячэйкі, камсамол, прафсаюзы павінны па-бальшавіцку ўзяцца за выкананьне лесазагатоўчых плянаў.

Дырэктывы партыі і ўраду павінны быць выкананы.

ЛАПАЦІК.

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН

Адпаведныя органы павінны зацікавіцца плешчаніцкімі і бягомльскімі справамі

Плешчаніцкі леспрамгас заданьне асобнага кварталу 1930 году па вывазцы толькі на 5 проц., што характарызуе паўнейшы правал гэтае работы.

Выкананьне пляновых заданьняў ударнага кварталу 1931 году ідзе яўна незадавальняюча.

За першую дэкаду студзеня загатоўлена дзелавой драўніны — 14.200 кубамэтраў замест 102.460. Дроў — 2.239 раўмэтраў, замест 25.340.

Пляны вывазкі фактычна сарваны. Дзелавой драўніны замест 220.840 кубамэтраў вывезена толькі... 4.563, або 2,1 проц., дроў — замест 42.220 раўмэтраў—800, або 1,9 проц.

Апарат леспрамгасу працуе абломаўскімі тэмпамі. Элемэнты бюракратызму, чыноўніцкага падыходу да гэтай важнейшай палітычнай справы—вось што характэрна для леспрамгасаўскага апарату.

Есьць факты простага шкодніцтва, контр-рэвалюцыйных выступленьняў супроць лесазагатовак.

„Не вазеце лесу...“

Дзесятнік Зэмбінскага вучлеспрамгасу на сялянскім сходзе гаворыць аб вывазцы лесаматар'ялаў, а лясны вартаўнік гэтага леспрамгаса на другім канцы вёскі праводзіць «свой» сход агітуючы:

— Ня слухайце. Не вазеце лесу, нам дзяржава нічога не дае, дык і мы ім фігу дамо.

Пратакол гэтага сходу падае ў рукі загадчыка зэмбінскага вучлеспрамгасу. Апошні прачытаў пратакол і нікому нічога не сказаўшы, падшыў яго да справы.

„Буду працаваць, не сьпяшаючыся“...

Сяляніна Аміяшанскага сельсавету, Плешчаніцкага району, арганізавалі чырвоны абоз па вывазцы лесаматар'ялаў. Прыехалі на прызначанае месца, а дзесятнік Вілейскага вучгаспу — Элькін, ведаючы аб гэтым, недзе зьнік.

— Раз мяне пэнсіі не падвавалі, дык я буду працаваць, не сьпяшаючыся. Я хоць і ведаю справу, але буду рабіць толькі тое, што мне скажуць, — пасьмейваючыся, расказвае сваім таварышам дзесятнік Элькін.

Сельсаветы і раённыя установы не павярнуліся тварам да лесазагатоўчага фронту. Адсутнічае ўсякая адказнасьць за выкананьне праграмы лесазагатовак і вывазкі.

„Мы давалі шмат дырэктыў“...

Пытаньне вывазак лесаматар'ялаў некалькі раз ставілася на прэзыдыуме Плешчаніцкага райвыканкому. Яго ставілі заўсёды апошнім пытаньнем і пасьля, дзякуючы «позьняму» часу, аусім зьнімалі з парадку дня. Райвыканком ня цікавіўся працывамі, якія дапушчаны на лесазагатоўчым фронце. Толькі з студзеня пытаньне аб прарывах было абгаворана на францыі. У сельсаветы пасталяліі накіраваць сваіх упаўнаважаных, большасьць якіх і па сёньняшні дзень на месцы ня выехала.

— Мы давалі і пасылалі шмат дырэктыў, — зьвесна замялі ў райвыканкоме. Праверкай выкананьня даных дырэктыў райвыканком не займаўся. Дырэктывы нярухома ляжаць у сельсавецкіх папках.

„У нас сваёй працы па вушы“.(?!)

— Лесазагатоўкі — ня наша справа. Нихай гэтым займаецца леспрамгас. Гэта яго кроўная справа. У нас і сваёй работы па вушы, — так разважаюць многія сельсаветы.

Пры перавыбарах сельскіх саветаў пытаньне лесазагатовак не закраналася. Цьвёрдыя заданьні у большасьці не даведзены да кулацка-заможнай часткі вёскі. Там, дзе кулацкія двары атрымалі свае нормы, — сельсаветы нічога не зрабілі для праверкі іх выкананьня.

Больш таго, у Вітуніцкім сельсавеце (Бягомльскі раён) цьвёрдыя заданьні былі даведзены да бядняцкіх бясконных гаспадарак.

„Ня будзе валёнак,—у лес і носу не пакажам“

Калгасы ня ўдзельнічаюць у лесазагатоўках і ў вывазцы загатоўленых матар'ялаў. Заданьні на вывазцы ня выкананы. З 60 калгасаў Плешчаніцкага раёну толькі тры прывялі некаторы ўдзел у выкананьні лесазагатоўчых плянаў.

Райкалтасаюз нічога не зрабіў для таго, каб надаць гэтай справе масавапалітычнае значэньне, стварыць вакол гэтага пытаньня шырокую грамадзкую думку.

Калі аб вывазцы лесаматар'ялаў загаварылі на нарадзе старшынь калгасаў Плешчаніцкага раёну, ніхто з іх ня ведаў умоў вывазкі і загатовак.

Старшыня калгасу «Чырвоная зорка» — член партыі выступіў з такой прамовай:

— Пакуль не дадуць 60 пар валёнак, 50 пар ботаў і рукавіц, — мы ў лес і носу не пакажам.

Прафсаюзы не зацікаўлены лесазагатоўкамі

Прафсаюзы і асабліва саюз Сельгаспрацоўнікаў, незадавальняючы. Адсутнічае сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва нават у сталых арцелях лесарубаў і возчыкаў.

Ніякае культасьветнае работы з лесарубамі не вядзецца. Забесьпячэньне лесарубаў і возчыкаў прамтаварамі і прадфражом пастаўлена з рук вон дрэнна.

Аб усіх гэтых фактах райком партыі, бясспрачна, ведае, але яму, бачыце, чамусьці «німа часу» займацца справамі лесазагатовак.

Чым інакш, як не праваапартуністычнай недаацэнкай лесазагатовак, можна назваць усе гэтыя факты?

У Бягомлі свае парадкі.

У Бягомльскім раёне не хапае кваліфікаваных кадраў лесазагатоўчага фронту, — асабліва дзесятнікаў.

А райком партыі, ня гледзячы на гэта, зьнімае з Вілейскага вучлеспрамгасу двох дзесятнікаў і пасылае аднаго ў кааперацыю, другога — сакратаром райсавету Асоўніхіму.

Брыгадзіры, якія накіроўваюцца на работу на лесазагатоўках, сустракаюць недапушчальна бюракратычныя адносіны з боку бягомльскіх раённых работнікаў.

„Я цябе з раёну выганю“

ЦСПСБ накіраваў у Бягомльскі раён двох камсамольцаў-рабочых для праверкі выкананьня лесазагатоўчых плянаў.

Калі таварышы на месцах спаткаліся з фактамі бязьдзейнасьці сельскіх саветаў і адзін з брыгадзіраў — тав. Мазэль зьвярнуўся ў раёнвыканком за дапамогай, старшыня Бягомльскага райвыканкому — тав. Русак адмовіўся з ім гаварыць, буркнуўшы пад нос:

— Калі ты камсамолец, дык не задавай мне ўсякіх там пытаньняў, а едзь і працуй.

Мазэль пайшоў у райком партыі. Сакратар РК — тав. Кляцко па пратэсты супроць бюракратычных адносін да важнейшай палітычнай кампаніі спакойна адказаў:

— Калі ты будзеш лазіць па ўстановах, дык я цябе з раёну выганю.

Бягомльскія галавацяпы ня любяць, каб іх габінэты сваёй парушалі пайкія там «малакасосы»-брыгадзіры.

„Рабочым—фігу...“

У Бягомлі маюцца факты простых злоўжываньняў. У мінулым годзе ў бягомльскую кааперацыю на імя леспрамгасу прыбыла 27 тыс. мэтраў мануфактуры для прамяньваньня лесарубаў. Кааперацыя разьмеркавала гэтую мануфактуру на сваім сямейным «усмотрэньні». Рабочым леспрамгасу засталася не мануфактура, а фіга.

РК КП(б)Б і райвыканком над пацісканьнем адпаведных органаў абмежаваліся зьнятьцем кіраўніцтва кааперацыі з работы. Злачынцы ня былі прыцягнуты да судовай адказнасьці толькі таму што імі былі прад'яўлены якіясьці магічныя пісулькі райкіраўніцтву.

„Гэта мяне зусім на цікавіць“

У 1930 годзе леспрамгас пабудаваў у Бягомлі дом пад кватэры спэцыялістам і іншым работнікам леспрамгасу і рабочому.

Гэтыя кватэры, пенядома на якой падставе, заняў сакратар райкому партыі — тав. Кляцко. Ён пагарбаваў падлогу і рахунак для аплаты паслаў у леспрамгас.

Калі ў сакратара РК — тав. Кляцко спыталі, як гэта адбылася, чаму ён заняў леспрамгасаўскае памяшканьне, апошні адказаў:

— Гэта мяне зусім ня цікавіць.

На партыйным сходзе райактыву таварышы, якія выступалі з крытыкай усіх гэтых ганебных фактаў, абмяркоўваліся ў кампрамэтацыі раённых работнікаў і г. д.

Самкрытыкі ў Бягомлі ня любяць і ўсякім чынам стараюцца абмаць ёй шыю.

У раёне існуе праваапартуністычная недаацэнка лесазагатовак, няма ніякае адказнасьці за выкананьне даных заданьняў.

Адпаведныя органы павінны зацікавіцца плешчаніцкімі і бягомльскімі справамі.

Трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці тых, хто сьвядома ня хоча выконваць дырэктывы партыі і ўраду ў справе выкананьня бальшавіцкай праграмы лесазагатовак.

ШАПЛЯЎ.

Як нацыянал дэмакраты дзейнічалі ў БДВ

Контр-рэвалюцыйныя беларускі нацыянал-дэмакратызм у сваім імкненьні накіраваць усё культурнае будаўніцтва ў буржуазным, нарожным справе садыялістычнага будаўніцтва і дыктатуры пралетарыяту кірунку, не абмінуў і такой важнейшай справы, як выдавецкая дзейнасьць. Больш таго, як пра гэта сьведчаць факты, беларускі нацыянал-дэмакратызм зрабіў з Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва сваю базу, свой апорны пункт. Што гэта так, сьведчыць хаця-б кароткі агляд дзейнасьці БДВ за час кіраўніцтва ім нацыянал-дэмакратамі.

Бярэм кнігасьніс БДВ, выданы да [illegible] БДВ. Як-бы ўпаўзіна мы яго не праглядзелі, мы ў гэй вялікай масе кніжак ня знойдзем ні адной работы Маркса ці Энгельса, такіх работ, якія на сёньняшні дзень ужываюцца штодзенна партыйцам, камсамольцам, настаўнікам і студэнтам. Мы тут знойдзем толькі 7 назваў кніжак, якія могуць так ці інакш прэтэндаваць на марксізм, выданых у далёкае не ў апошнія гады дзейнасьці БДВ. Такім чынам, беларускія нацыянал-дэмакраты, якія аселе ў БДВ, лічылі, што беларускі пралетар, селянін, студэнт, партработнік могуць абысьціся некаторымі пазіт-надручнікамі. Ні Маркс, ні Энгельс, ні іншыя клясыкі марксізму ім непатрэбны.

Праводзячы такую зусім сьвядомую лінію на затрыманьне, або зусім ня выданьне марксыцкай літаратуры, нацыянал-дэмакраты побач з гэтым прааўлялі вельмі вялікую актыўнасьць у справе выданьня літаратуры, прасякнутай нацыянал-дэмакратычнымі ідэямі.

Аб ходзе будаўніцтва МТС

ПАСТАНОВА СНК БССР

Заслухаўшы даклад упаўнаважанага Трактарацэнтру ў БССР пра ход будаўніцтва машына-трактарных станцый, СНК БССР адзначае, што:

а) на гледзячы на асабліва важнае значэнне, якое набываюць машына-трактарныя станцыі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, многія цэнтральныя і мясцовыя арганізацыі недаацэньваюць значэнне іх, у сувязі з чым будаўніцтва 23 першых у БССР машына-трактарных станцый працягваецца нездавальняюча (яшчэ ня ўсе машына-трактарныя станцыі забяспечаны кіруючым персаналам, апошнясьць гэтых станцый не забяспечана аграномамі, амаль не распачата загатоўка будаўнічых матар'ялаў, нездавальняюча праходзіць рамонтная кампанія, зусім не забяспечаны машына-трактарныя станцыі бакамі для гаручага, падрыхтоўка кадраў знаходзіцца пад пагрозай зрыву);

б) зусім нездавальняюча разгорнута масавая работа сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў, у выніку чаго амаль не пачата заключэньне дагавораў на ўзворку зямлі і гэтым самым машына-трактарныя станцыі яшчэ не адыгрываюць тэй ролі, якую яны павінны адыгрываць у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі;

в) работа па мабілізацыі сродкаў насельніцтва на будаўніцтва машына-трактарных станцый праходзіць зусім марудна (рэалізацыя акцый Трактарацэнтру).

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, СНК БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць Народны Камісарыят Зямляробства, упаўнаважанага Трактарацэнтру, калгасна-каапэрацыйную сыстэму і раённыя выканаўчыя камітэты арганізацыю і будаўніцтва машына-трактарных станцый пастаявіць у цэнтр увагі сваёй працы з тым, каб на справе машына-трактарныя станцыі, побач з савецкімі гаспадаркамі, зьяўляліся апорнымі пунктамі ў правядзеньні сацыяльнай калектывізацыі і на гэтай аснове ліквідацыі кулацтва, як клясы.

2. Абавязаць Народны Камісарыят Зямляробства ў 1931 г. асноўную частку трактараў, вызначаных для капгасаў, накіраваць па лініі арганізацыі машына-трактарных станцый з тым, каб колькасьць машына-трактарных станцый да канца году давесьці да 27.

3. Даручыць упаўнаважанаму Трактарацэнтру і Народнаму Камісарыяту Зямляробства да 15 лютага 1931 г. падаць у СНК з заключэньнем Дзяржпляну плян будаўніцтва машына-трактарных станцый у 1932 г., у якім павінна быць забяспечана правільнае геаграфічнае размяшчэньне іх, улічыўшы эканамічныя і прыродныя ўмовы асобных раёнаў і ступень калектывізацыі рэёну.

4. Зацьвердзіць наступную вытворчую праграму Трактарацэнтру па БССР на 1931 г.: УЗАРАЦЬ 466.700 ГЭКТ. І ПАСЕЯЦЬ 213.300 ГЭКТАРАЎ, З ІХ ВЯСНОЮ УЗАРАЦЬ 230.000 ГЭКТ. І ПАСЕЯЦЬ НЯ МЕНШ 60.000 ГЭКТ.

5. Абавязаць упаўнаважанага Трактарацэнтру, раённыя выканаўчыя камітэты і дырэктароў машына-трактарных станцый неадкладна разгарнуць работу па заключэньні дагавораў паміж станцыямі, калгасамі і вёскамі, разглядаючы гэту кампанію, як ВАЖНЕЙШУЮ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНУЮ КАМПАНІЮ, ЯКАЯ ПАВІННА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УЗМАЦНЕНЬНЕ МАСАВАГА ПРЫЛІВУ Ў КАЛГАСЫ, ЯКІ РАСПАЧАЎСЯ.

Пры заключэньні дагавораў машына-трактарныя станцыі павінны выходзіць з задач аб'яднаньня усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія абслугоўваюцца машына-трактарнымі станцыямі, у сельска-гаспадарчыя арцелі і пераходу таварыстваў грамадзкай апрацоўкі зямлі, якія абслугоўваюцца машына-трактарнымі станцыямі, на статут арцеляй.

6. Для рацыянальнага скарыстаньня конскай цягавай сілы абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і дырэктароў машына-трактарных станцый пры складаньні вытворчых плянаў калгасаў строга ўлічваць скарыстаньне конскай цягавай сілы для выкананьня вытворчых заданьняў, праводзячы адпаведную растлумачальную працу сярод калгаснікаў і бядняцка-серадняцкага насельніцтва, шырока азнаямляючы калгаснікаў з п. 18. прыкладнага дагавору машына-трактарных станцый з калгасамі, які забаранае продаж коняй бяз згоды машына-трактарных станцый.

7. Абавязаць Народны Камісарыят Зямляробства і ўпаўнаважанага Трактарацэнтру не пазней 10 ЛЮТАГА 1931 г. цалкам укамплектаваць машына-трактарныя станцыі дырэктарамі і агрономамі.

8. Абавязаць Народны Камісарыят Зямляробства, упаўнаважанага Трактарацэнтру і раённыя выканаўчыя камітэты рашуча ўзмацніць работу па рамонце трактараў, сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару, скарыстоўваючы ў максымальнай меры наяўныя матар'ялы і ўжываючы адначасова захады да своячасовага завозу запасных частак і патрэбных рамонтных матар'ялаў.

Побач з работаю па рамонце машын для веснавой пасеўнай кампаніі разгарнуць работу па рамонце ўсіх складзных сельска-гаспадарчых машын, якія патрэбны для ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

9. Адзначаючы выпадкі ўмешваньня раённых выканаўчых камітэтаў (СІРОЦІНСКІ, ЛЕЗЬНЯНСКІ, ГАРАДОЦКІ І ІНШ. РАЁНЫ) у апэрацыйна-гаспадарчую дзейнасьць машына-трактарных станцый, абавязаць усе раённыя выканаўчыя камітэты ня ўмешвацца ў апэрацыйную дзейнасьць машына-трактарных станцый, якія працуюць на падставе цьвёрдых плянаў і адзіначальля. Побач з гэтым абавязаць дырэктароў машына-трактарных станцый няўхільна праводзіць усе дырэктывы мясцовых кіруючых арганізацый, накіраваныя на паляпшэньне працы машына-трактарных станцый і порыядычна ставіць даклады аб дзейнасьці станцый на пасяджэньнях раённых выканаўчых камітэтаў.

10. Абавязаць упаўнаважанага САЮЗНАФТЫ і БЕЛКААПСАЮЗ пад персональную адказнасьць упаўнаважанага Саюзнафты і т. ХАСКІНА закончыць будаваньне і ўстаноўку нафтабакаў у глыбінных пунктах не пазней 1 САКАВІКА 1931 ГОДУ і пры станцыйных не пазней 15 САКАВІКА 1931 ГОДУ, своячасова забясьпечыўшы завоз у дастатковай колькасьці гаручых і змазачных матар'ялаў для забеспячэньня трактарнага парку ў веснавую пасеўную кампанію. Адначасова даручыць Дзяржпляну разам з Белкаапсаюзам і Народным Камісарыятам Зямляробства ўжыць захады да здабыцьця і выпучэньня патрэбнай колькасьці месца для будаўніцтва нафтабакаў.

11. Абавязаць галоўдартранс БССР і раённыя выканаўчыя камітэты зараз распачаць у раёнах дзейнасьці машына-трактарных станцый падрыхтоўку патрэбных матар'ялаў для рамонту дарог і мастоў для бесперапыннай працы машына-трактарных станцый.

12. АБВЯСЬЦІЦЬ ВЫМОВУ СТАРШЫНЯМ АСЬВЕЙСКАГА, ЖЫТКАВІЦКАГА І ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАГА РАЁННЫХ ВЫКАНАЎЧЫХ КАМІТЭТАЎ ЗА ПРАЯЎЛЕНУЮ ІМІ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ У РЭАЛІЗАЦЫІ АКЦЫЙ ТРАКТАРАЦЭНТРУ.

Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, упаўнаважанага Трактарацэнтру, калгасна-каапэрацыйную сыстэму і беларускую кантору Дзяржбанку забясьпечыць поўнае выкананьне заданьняў па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру з такім разьлікам, каб вызначаныя для рэалізацыі акцыі Трактарацэнтру ў БССР у сумс 5.900 ТЫС. РУБ., з іх у 1-м квартале 1931 г. 2.188,4 ТЫС. РУБ., БЫЛІ ЦАЛКАМ РЭАЛІЗАВАНЫ.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Зямляробства будаўніцтва новых станцый разгортваць толькі ў тых раёнах, дзе будзе лепш пастаўлена рэалізацыя акцый Трактарацэнтру.

13. Абавязаць Народны Камісарыят Зямляробства, упаўнаважанага Трактарацэнтру і Народны Камісарыят Асьветы неадкладна ўзмацніць работу па падрыхтоўцы кадраў для машына-трактарных станцый з тым разьлікам, каб не пазьней 15 сакавіка 1931 г. усе машына-трактарныя станцыі поўнасьцю былі забясьпечаны старшымі рулявымі і трактарыстамі, адначасова арганізаваўшы работу па падрыхтоўцы кіруючых кадраў для новых машына-трактарных станцый, будаўніцтва якіх будзе ў далейшым разгортвацца.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. кіраўніка спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР Л. ДУБАВІЦКІ.

30 студзеня 1931 г.
Гор. Менск.

У выдаецтве, 1-га лютага, а 7 гадз. веч. у памяшк. 2-й школы (суворф пошты)

НАЗНАЧАЕЦЦА

збор авіяхіматрадаў гораду

Явка ў форме абавязкова.

Па Савецкай Беларусі

Праваліці кампанію самаабкладаньня

КАПЫЛЬ (Наш кар.). Раённыя арганізацыі праваліці кампанію самаабкладаньня. Замест таго, каб да 25 верасьня, паводле пастановы СНК, скончыць правядзеньне сходаў па самаабкладаньні, апошнія па Капыльшчыне пачалі праводзіцца толькі ў кастрычніку. У выніку, да гэтага часу сходы па самаабкладаньні яшчэ ня ўсюды праведзены.

Апошнім тэрмінам сканчэньня самаабкладаньня было вызначана 1 сьнежня. Між тым на Капыльшчыне на 10-е студзеня плян самаабкладаньня выкананы усяго на 57 проц.

Упаўнаважаныя РВК ня цікавіліся своячасовым выкананьнем пляну і не вялі ніякай растлумачальнай работы сярод насельніцтва.

14 лістапада Наркамфін БССР, канстатаваўшы правал кампаніі па самаабкладаньні ў Капыльскім раёне, паведаміў аб гэтым раённага пракурора і прасіў прыцягнуць да судовай адказнасьці загадчыка райфа тав. Шабана. Аднак, капыльскі пракурор не надаў значэньня гэтай справе і пераслаў яе «для выкананьня»... міліцыі. Апошняя абмежавалася толькі допытам Шабана і на гэтым... паставіла крапку.

Растраты ў саматужных арцелях м. Сенна

СЕННА. (Наш кар.). Камісія РСІ абследавала саматужныя арцелі мястэчка Сенна. Камісія выкрыла шмат агідпасьцяй у рабоце арцеляй.

Некаторыя члены арцеляй сыстэматычна п'янствавалі. Прадсыцыпліна адсутнічала, самакрытыка ня была разгорнута. Арцель возчыкаў аказалася ілжэ-арцеллю. У некаторых арцелях кампаніі месца растраты. Упаўнаважаны райсамправсаюзу Кандрацьцеў на ўсе гэтыя факты зусім не рэагаваў. Наадварот, ён патураў растратчыкам. Кандрацьцеў ігнараваў пастанову РСІ аб зьнятьці з работы ў арцелі былога буйнага гандляра Шмідта.

Камісія абвясьціла Кандрацьцеву вымову і зьняла яго з работы.

Прыняты захады да аздараўленьня работы арцеляй.

На рыхтуюцца да веснавой сяўбы

ВОРША. (Наш кар.). РВК, гарсавет і райкаапсаюз не вядуць падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Для арганізацыі насеннафонду нічога на робіцца. Збожжахавальнікі для ссыпкі збожжа не падрыхтаваны.

Райкаапсаюз увесь час толькі і робіць, што... спрачаецца з рознымі арганізацыямі наконт памяшканьняў для збожжахавальнікаў.

Л—д.

Блуканьне... вагону са збожжам

ЖЛОБІН. 4-га студзеня са станцыі Мормаль быў накіраван Жлобінскаму аддзяленню Саюзхлеба вагон са збожжам. Адміністрацыя станцыі Жлобін бяз усякай падставы накіравала гэты вагон на поўдзень, як парожні...

У Бахмачы вагон быў затрыманы і ў сваю чаргу накіраван чамусьці... у Менск.

Толькі 14 студзеня пасьля доўгіх вандраваньняў са станцыі на станцыю, вагон, нарэшце, трапіў на месца прызначэньня.

РСІ павінна прыцягнуць вінаватых у гэтым абураючым зьявішчы да адказнасьці.

ВЕДАЮЧЫ.

За дзень

— **Цэнтральнае праўленьне Аўтадору БССР** разаслала ўсім сваім арганізацыям наказ уключыцца ў падрыхтоўку да бальшавіцкае вясны.

Аўтадораўцы намінны прынялі актыны ўдзел у рамонце с.-г. машын.

— **Прэзыдыум ВСНГБ** назначыў тав. Драгалёва кіраўніком новай пазнайнай фабрыкі ў Віцебску, тав. Кагана—кіраўніком фабрыкі «Прафінтэрн» і тав. Дсбкіна—кіраўніком акулярнай фабрыкі.

— **20 лютага** ў Менску адбудзецца **гарадзкая канфэрэнцыя Аўтадору.** У парадку дня—даклады цэнтральнага і гарадзкога праўленьняў Аўтадору і перавыбары кіруючых органаў.

28 студзеня закрылася ўсебеларуская вытворчая канфэрэнцыя гарбароў. Канфэрэнцыя абгаварыла пытаньні аб паляпшэньні якасьці прадукцыі і рацыяналізацыі работы на прадпрыемствах.

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— **Менгарком.** У 12 з паловай гадз.— у культпропе Гаркому—нарада рэдактараў наступных газэт: «Зьвязда», «Рабочий», «Савецкая Беларусь», «Акцябр», «Беларуская Вёска», «Чырвоная Зьмена» і «Піянэр Беларусі», а таксама начных рэдактараў, наказаных газэт, заг. друкарні «Зьвязда» і друк. Імя Сталіна, заг. кантор: «Зьвязда», «Рабочий», «Савецкая Беларусь», «Акцябр», «Беларуская Вёска» і «Чырвоная Зьмена».

— **ЦСПСБ.**—У 18 гадз. у залі пасяджэньняў—нарада ўсіх вымагаючых на калдагаворнай кампаніі і прымацаваных да Менскіх прадпрыемстваў, прадстаўнікоў ЦП і ФЗМК прадпрыемстваў і гаспадарнікаў. Парадак дня: 1. Папярэднія вынікі калдагаворнай кампаніі (інфармацыі выяжджаючых на месцы).

— **БДУ.**—У 18 гадз., у аўд. № 1 прыход. корпусу,—адкрыты сход партактыву падфаку ВДУ. Парадак дня: 1. Вынікі студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б (тав. Усьпенскі). 2. Справа тав. Сосіса.

ЗАЎТРА:

— **У культпропе ЦК КП(б)Б** у 12 гадз.—пасяджэньне фракцыі праўленьня асацыяцыі марксыстаў навуковых таварыстваў. Выклікаюцца т. т. Сэрбэнта, Спякевіч, Пашкевіч, Канаплін, Гаміл, Сякерская, Горын, Мельцер, Зюзькоў, Лур'е. Зьявіцца своячасова.

— **Дом Камасьветы.**—У 10 гадз. ранк. заняткі семінару рабочых прапагандыстаў. Яўка абавязкова. У 19 гадз., у пак. № 24,—групавая кансультацыя для прапагандыстаў пачатковых школ па чарговай тэме.—«Барацьба за ленінскую лінію ў партыі».

— **БДУ.** У 20 з паловай гадз., у аўд. 302 гал. корп.,—адкрыты партыйна-камсамольскі сход наргасу, па пытаньні:— «Вынікі студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б». Запрашаюцца студэнцтва і навуковыя працаўнікі.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і газэтная кантора
Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	10-74	Галоўная на горах	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі
(з дарожным дадаткам „Прадрух")

На 1 мес.	1 р
„ 3 мес.	3 „
„ 6 мес.	6 „
„ 12 мес.	12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншых гарадзкіх абвестак—1 р. за радок. Пасьлятэксту—у два разы дарожэй. Кантрагент-ны рахунак выдавецтва № 52100301 у Дзяржбанку.

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 63, 2-ы паверх тэл. 7-31.

120.000 рублёў страт на нізкагатунковасьці

На старонках «Зьвязды» многа раз паведамлялася аб келскай якасьці абутку нашых фабрык. Вынікі работы ўдарнага кварталу сыгналізуюць, што якасьць абутку НЕ ПАЛЕПШЫЛАСЯ. Процант нізкагатунковага абутку надта вялікі. Некаторы пералом у кастрычніку не замацаваны. Лістапад і сьнежань па ўсіх абутковых фабрыках далі павялічэньне процанту нізкагатунковага абутку.

На нядобраякасным абутку фабрыкі штомесячна трацяць дзесяткі тысяч рублёў, ня лічачы таго, што спажывец атрымлівае келскай якасьці абутак хоць і за ніжэйшую цану. За ўдарны квартал абутковыя фабрыкі на зьніжэньні якасьці абутку страцілі 120.000 руб.

АСАБЛІВА КЕПСКІ АБУТАК ВЫПУСКАЕ ГОМЕЛЬСКАЯ ФАБРЫКА «ПРАЦА». Замест 92 проц. першага гатунку, фабрыка ва ўдарным квартале дала толькі 40 проц. абутку першага гатунку. Значна павялічыўся процант трэцяга гатунку і браку. На гэтым фабрыка страціла 70.000 руб.

ВІЦЕБСКАЯ АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА ў кастрычніку дала 90 проц. першага гатунку замест 95 проц., у лістападзе—87 проц., у сьнежні—84 проц. Такім чынам, чым далей, тым ФАБРЫКА ПРАЦАВАЛА ЎСЁ ГОРШ. Брак замест 0,03 проц. дасягнуў у сьнежні 1 проц. 20.000 руб. — вось страты фабрыкі з-за нізкагатунковасьці за ўдарны квартал.

На палш етаіць справа на МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫЦЫ, якая замест 95 проц. першага гатунку выпусьціла ў кастрычніку толькі 83 проц., у лістападзе — 75 проц., і ў сьнежні — 77 проц. На гэтым фабрыка страціла 30.000 руб.

Брак і нізкагатунковасьць абутку тлумачыцца ў большасьці выпадкаў наступнымі прычынамі: няправільнай і келскай падборкай крою, крывая загатоўка, дрэнная строчка, няправільная ўстаўка заднікаў, келскае прымацаваньне падэшвы, слабая зацяжка і г. д. Значную частку абутку прыходзіцца перарабляць (крывыя абсацы, няправільная рантоўка і г. д.). На ВІЦЕБСКАЙ абутковай фабрыцы за ўдарны квартал пераробленa ЗВЫШ 6.000 ПАР АБУТКУ. На ГОМЕЛЬСКАЙ фабрыцы — капя 2.500 пар. Колькі матар'ялаў і рабочага часу патрачана на гэтыя пераробкі?

Усё гэта сьведчыць аб тым, што ФАБРЫЧНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЯШЧЭ НЕ АДДАЮЦЬ ВЫСТАРЧАЛЬНАЙ УВАГІ ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦЫІ. Рабочы калектыў не мабілізуецца на барацьбу за якасьць.

Фабрычныя арганізацыі павінны паставіць барацьбу за якасьць цэнтральным пытаньнем.

АБУТНІК.

Будаўнічыя матар'ялы—панчошнай фабрыцы

ВІЦЕБСК. Для набудовы другой чаргі Віцебскай панчошнай фабрыкі не хапае будаўнічых матар'ялаў. Няма цэменту, дошак, шкла і інш.

На іншых набудовах ёсьць лішкі матар'ялу, аднак, яны не перакідваюцца на набудову панчошнай фабрыкі. Так, на набудове клюбу панчошнікаў ёсьць лішні вагон цэменту.

МЕНСКІ ГАРАДЗКІ КАМІТЭТ КП(б)Б
скліча

СЕНЬНЯ ў 6½ гадз. веч. у ДОМЕ КАМАСЬВЕТЫ (клюб К. Маркса)

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТАКТЫВУ

з парадкам дня:
Становішча і задачы рабочага забесьпячэньня на падставе пастаноў ЦК УсесКП(б) і пленуму ЦК КП(б)Б—дакл. ХАСКІН.

На сход партактыву запрошаны зьявіцца: сакратары парткалектываў, ячэек, пох. ячэек і члены бюро, ячэйкавыя агітатары, прапагандысты партшкол, т. т. вытучаныя агіт.-масавым аддз. ГК КП(б)Б дакладчыкамі на ячэйкавых сходах, члены фракцый ЦП прафсаюзаў і ФЗМК, кіраўнікі ўстаноў і прадпрыемстваў—камуністы.

Прапануецца сакратарам ячэек КП(б)Б атрымаць білеты ў гаркоме КП(б)Б 30-га і 31-га студзеня з 10 да 4 гадз. дня (пакой № 10).

ГАРКОМ КП(б)Б.

ВЫШЛІ З ДРУКУ і рассылаюцца па папярэдняй падпісцы

СТЭНАГРАМЫ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Тыраж жорстка абмежаваны.

Цана 4 руб. 50 кап.
Стар. 836.

Па папярэдняй падпісцы высылаюцца ў кардоннай вокладцы.

Беларуск. Другі Дзяржаўны тэатр
Сёньня, 31 студзеня—адкрыты сезонтаньне
„ПЕРШАЯ КОННАЯ"
Пачатак у 8 гадз. веч.

ЛУКАЛЬ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Новы сакрэтны фільм вытворчасьці Саюзкіно (трэсту Богданькіно) **РУБІКОН** драма ў 7 частках. Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г., 5 гз., 1 г., 30 хв. Касы адкрыты з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА" — **ВЕЧАР З ПАЛОГАМ** кінасюжэт з 7 ч. Згыбы в аграмы. ВЫКІДАЕЦЬ ЗЯЛЬ БЕР ПОР—кінасатырык. ПАРЕЗ 2— ТАНЦЮЖОНГЛЯРЫ. Пачатак у 1 г., 8 г. 40 м., 1 10 м. 20 м. Касы—з 5 гадз.

Кіно „ПІЗЭРКА-ПІЯНЭР" — В остатні фільм **ЧАЛАВЕК З РЭСТАРАНУ** Зьвыш праграмы: НЕ ЗА-НАРЫС у 2 ч. **Наш уклад у пацігодку** Пачатак 1-га сэансу—6 гадз. Касы—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „ГАЛІЛЕЯ" — Амэрыканскі прыгодніцкі фільм **НАЧНЫ КРЫК** Пачатак: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса адкрыта—з 4 з пал. гадз.

КІНО „ЮВЫ ШІЯНЭР" — Лепшы гістарычны фільм вытворчасьці „Совкіно" **ДВА БРАНЯВІКІ** ў 6 частках. Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня. Каса адчынена—з 12 гадз. дня. З пакаёлка, 76 студзеня

КІНО „СПАРТАК" — Сьвяці **Барацьба гігантаў** драма ў 10 частках. Пачатак сэансаў: 1 с.—7 г., 2 с.—9 г., 3 с.—11 г. Каса—з 5 гадзін.

Менгарком КП(б)Б разам з ЦСПСБ праводзіць 2-га лютага ў 7 гадз. веч. у Доме Камасьветы
зьлёт прэміяваных рабочых
за першыя 2 гады пяцігодкі з
з пагадкам дня: «задачы прэміяваных рабочых у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі».
Прапануецца ўсім—сакратарам парткалектываў і яч. КП(б)Б атрымаць білеты для дэлегатаў зьлёту ў гаркоме КП(б)Б з 29-1 па 2-II-31 г. у пакоі № 10.
Менгарком КП(б)Б і ЦСПСБ.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА. Сэктар кнігараспаўсюджваньня.
ВЫШЛА З ДРУКУ:
Укаючыце школу ў свой прамфінплян. 20 стар. Цана 5 к.
І продаж утвараецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і крамах спажыўкаапэрацыі.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ — ГЭТЫМІ ДНЯМІ
НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
АМЭРЫКАНКА
У выпадку незкуратнага атрыманьня газэты ЗВАНЕЦЕ па тэлеф. № 15-42
Кошт публікацыі АБ ЗГУБЕ 1 дакумэнту 1 р.

Даводзіцца да ведама ўсіх студэнтаў ВЯЧЭРНЯГА Камуністычнага унівэрсытэту, што канцэлярыя адпачынак канчаецца 1-га лютага і з гэтага часу пачынаюцца заняткі ва ўсіх аддзяленьнях. Усе студэнты павінны зьявіцца ў вызначаны часу НА ЗАНЯТКІ. Вячэрні Камсуз.

ПЭДФАК БДУ
ПРАПАНУЕ
таварышам, якія СКОНЧЫЛІ КУРСЫ ПІЯНЭР-ПРАЦАЎНІКОЎ па падрыхтоўцы на пэдфак, і СТУДЭНТАМ, СКОНЧЫВШЫМ МЕНСКІ РАБФАК і накіраваным на пэдфак
ЗЬЯВІЦЦА 9 лютага 31 году на пэдфак БДУ.
Заняткі з І-ы пачнуцца 10 лютага г. г.
Дэкан пэдфаку Рудніцкі.

Завочныя Дзяржкурсы Росьпісу
(РАЗРЫСОЎКІ) па ўсеагч. тканінах. Фарбамі: рэльефн., алейн., эмалев. пырскамі. Прысьпяжкамі: бліскуч., бісер, жакчуг і інш.
Спосабы нерэпрыйч. аніліну, праз ст. росьпісу мяжнага золата. Неляюлёўда, скуры, дэрэв. Да лекцый прыкладаецца звыш 200 малюнк. (акрамя тэкставых).
Па скончэньні выд. пасьведчаньне. Уменьне малюн. не патрэбна. Падрабязнасьці высыл. за 20 к. дробн. пошт. маркамі.
МАСКВА, вул. Дзяржынскага, д. № 1. ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ СЕКО.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА — СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ.
ВЫШЛІ з ДРУКУ
ПРАГРАМА ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ
39 арк. — Цана 7 кап.
Продаж утвараецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і крамах спажыўкаапэрацыі.

СТАРА-БАРЫСАЎСКІ СЬВІНАГАДОЎЧЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае, што з 1-га лютага па 15 сакавіка праводзіцца
ПРЫЁМ ЗАЯЎ на ПЕРШЫ КУРС.
Прымаюцца асобы ад 16 да 25 год.
Асобы, якія скончылі поўны курс 9-гадовай працоўнай школы, школы 2-й ступені, 2-гадовыя агульна-адукацыйныя курсы, курс 7-гадовай працоўнай школы, школы ФЗН, дзесяцігадовага тыпу, ЦКМ, с.-г. прафшколы і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы—пры паступленьні ў тэхнікум прымаюцца без іспытаў.
Да заявы прыкладаюцца наступныя дакумэнты: 1) Анкета па форме, якая ўстаноўлена для паступаючых у тэхнікум, завераная прафэсіянальнымі або савецкімі арганізацыямі; 2) дакумэнт аб узросце (метрыка); 3) дакумэнт аб адносінах да ваеннай павіннасьці (для мужчын); 4) дакумэнт аб асьвеце; 5) зьвае фатаграфічныя карткі; 6) медыцынае пасьведчаньне аб стане здароўя; 7) дакумэнт аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў (для калгасьніку—даведка аб уступленьні ў калгас, для селяніна—даведка сельсавету аб уплаце с.-г. падатку).
З 15 сакавіка па 1 красавіка будуць разглядацца заявы аб залічэньні, а з 1 красавіка пачнуцца заняткі.
У веснавы набор будзе прынята 150 асоб.
Стыпендыяні будуць забясьпечаны, згодна пастановы ўраду ад 16-IX—30 г.
Заявы і дакумэнты накіроўваць па адрасе: г. Барысаў, Стара-Барысаўскі Сьвінагадоўчы Тэхнікум.
Дырэктар Тэхнікуму Жукаў.

Да ведама ўсіх арганізацый, студэнтаў і выкладчыкаў.
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ БУДАЎНІЧЫ ІНСТЫТУТ, на падставе пастановы ўрадовай камісіі ад 29 1—31 г.,
перамясьціўся ў памяшканьне былога Менскага рабфаку—
рог Чырвонаармейскай і Унівэрсытэцкай вул.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня

МАШЫНІСТКА, з ведамасьцю беларускую мову **ПАТРАБУЕЦЦА**
Звяртацца да сакратара рэдакцыі з 9 да 5 гадз. штодзеня.

Трэстам „СЬВІНАВОД" у г. Менску
адкрываюцца курсы для падрыхтоўкі ст. бухгальтараў і бухгальтараў для работы ў беларускіх саўгасах трэсту.
Прыняты слухачы з моманту прыёму 1 да 1-IV-31 г. праходзяць вытворчую практыку ў саўгасах і пасьля гэтага 4-месячны курс тэарэтычнага навучаньня ў г. Менску.
УМОВЫ ПРЫЁМУ:
а) За час вытворчай практыкі і тэарэтычнай падрыхтоўкі слухачы забясьпечваюцца стыпендыяй у памерах 120 р. у месяц.
б) Слухачы інтэрнатамі не забясьпечваюцца, а замест гэтага выплачваюцца квартэрныя грошы за кошт трэсту ў памерах да 10 руб. у месяц.
в) Па скончэньні курсу слухачы абавязаны прапрацаваць у саўгасах „Сьвінавод" на пасадах: 2 год у якасьці ст. бухгальтара або нам. ст. бухгальтара з акладзім ад 150—200 р. пры дарожных камунальных посьлугах.
г) Слухачам аплачваюцца ўсе фактычныя выдаткі, зьвязаныя з пераездам,—ад Менску да саўгасу і назад.
д) На курсы прымаюцца асобы ўзросту да 40 год. якія маюць на менш 2-гадовага стажу ў якасьці бухгальтара, а рахункаводы 4—5 гоц. Для членаў КП(б)Б і ЛКСМ пэрабаваньні могуць быць зьніжаны.
е) Заявы з дадаткам: 1) анкетнае пераклікі ноўй працоўнага сьпісу, 2) даведкі аб сацыяльным становішчы, пахаджэньні і аб падатку, 3) даведкі аб годзе нараджэньня, 4) даведкі аб перш. і проф. прыналежнасьці треба накіраваць не пазьней 10 лютага 1931 г. у Беларускую Кантору Трэсту „Сьвінавод" па адрасе: г. Менск, Савецкая, 70.
Бенкантора Трэсту „Сьвінавод".

Згубленыя і украдзеныя дакумэнты
пічыць несапраўднымі

Камс. біл. Фрунз. РК ЛКСМВ Бабкевіч Я. П., 3869; чл. біл. № 11350 с. СГО Мялешка Т. Н., 3870; чл. біл. № 6148119 с. буд. Капуры В. Ф., 3872; вайск. кн. Астр.-Гар. РВК, дав. аб пр. Мен. Камгасу Ігнатовіча Д. А., 3873-3874; вайск. біл. Мен. ваенк. Мякоты П. С., 3875; пасьв. ас. к-ры 5 вуч. МВВ ч. Каленіка У. М., 3876; студ. біл. ВПТ Тунікта Ц. А., 3877; чл. біл. № 178700 с. гарб. Крэйндзель А. Н., 3878; дав. аб нар. дзіц. Вабр. ЗАГС Васько А. Я., 3879; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Юзефовіч М. П., 3880; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Юзефовіч І. П., 3881; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Юзефовіч В. П., 3882; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Юзефовіч Л. П., 3883; чл. біл. № 3938 с. СГПР Жлобава Ф. Д., 3884; шлюбн. пасьв. Новарас. ЗАГС Шэршуна М. П., 3885; пашп. Мен. міл. Карповіч Ю. М., 3886; вайск. біл. Засл. с.-с., віза Анус. с.-с. Лычкоўская І. В., 3887-3888; пашп. Мен міл., дав. аб пр. гол. Мен. міл. Рубана Т. С., 3889-3890; кон. карт. Самахв. р. Леўко С. Д., 3891; пасьв. ас. Залатар В. М., 3892; пэнс. кн. Мен. страхк., мэтр. вып. Мен. ЗАГС Букач Н. І., 3893-3894; чл. біл. № 964 с. працасьв. Мэрзон М. Я., 3895; пасьв. ас. № 234 Мен. адда. ВПО Кавалевіч В. М., 3896; чл. біл. № 2757 Арш. адда. с. РЗЛ Раўдо А. С., 3897; мэтр. вып. ЗАГС Яськова Р. Л., 3898; чл. біл. с. палаўн. Самахв. с.-с. Вачыло А. П., 3899; вайск. пасьв. Мен. ваенк. Ігольніка Б. М., 3900; пашп. Мен. міл. Суботка К. Ф., 3901; чл. біл. с. метал. Чэрніка А. Я., 3902; шлюбн. пасьвед. Мен. ЗАГС Крэйндзель А. Н., 3903; кааперр. кн. спаж. т-ва «Зямляроб» Плашчынскага І. М., 3904; вайск. біл. б стр. в. Герасіменкі Н. Е., 3905; чл. біл. с. РЗЛ Купцевіч А. С., 3906; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Купцевіч А. А., 3907; мэтр. вып. Дуды. с.-с. Купцевіч В. А., 3908; дав. Мен. ЗАГС аб сьмерці Купцевіча А. С., 3909; каап. кн. спаж. т-ва «Зямляроб» Купцевіч М. М., 3910; дав. аб пр. гол. Мен. міл. Вачынэр Р. С. 3911; курс. біл. № 62 ЦШ Жызьнеўскага М. О., 3912; парт. біл. № 1396452 Самахв. РК КП(б)Б Касьцялецкая А. А., 3913; чл. біл. № 80445 с. працмаст., вайск. біл. 38 п. Лелюкова Я. К., 3914-3915; пашп. Мен. міл. Гершановіча В. І., 3916; пашп. № 1298 Мен. міл., вайск. кн. № 197, Мен. ваенк. Маршак Р. Пі., 3917-3918; чл. біл. с. МСП, бірж. тал. Мен. бірж. пр., дав. аб пр. Тагін. сан. больн. Рымны Ю. А., 3919-3921; лек. кн.